ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.02.2023 № 50

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце**
**«Беларуская мова і літаратура»**
**для V–XII класаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў з рускай мовай навучання і выхавання для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення**

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова і літаратура» (далей – вучэбная праграма) прызначана для V–XII класаў спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў з рускай мовай навучання і выхавання для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення (далей – вучняў).

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на вывучэнне беларускай мовы і літаратуры ў V класе – 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень), у VI–XII класах – 70 гадзін (2 гадзіны на тыдзень).

3. Мэта – сфарміраваць у вучняў сістэму ведаў пра мову і маўленне, навучыць карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо).

4. Задачы:

засваенне сістэмы мовы (фанетыкі, лексікі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу), норм беларускай літаратурнай мовы (моўная кампетэнцыя); фарміраванне маўленча-камунікатыўных уменняў на аснове авалодання рознымі відамі маўленчай дзейнасці, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні (маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя); усведамленне мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы, валоданне нормамі маўленчага этыкету (лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі).

5. На вучэбных занятках рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя метады навучання і выхавання: паведамленне педагагічнага работніка (далей, калі не вызначана іншае, – настаўнік) гутарка, самастойная праца, выкананне практыкаванняў, творчыя работы, эўрыстычны дыялог, моўныя і ролевыя гульні, віктарыны, конкурсы і іншае.

Мэтазгодна спалучаць франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання, выкарыстоўваць такія віды ўрокаў, як урок-гульня, урок-падарожжа і іншыя.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў. Для дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці выкарыстоўваюцца толькі навучальныя віды пісьмовых работ.

Асноўнымі прынцыпамі адбору зместу навучання беларускай мове для вучняў з’яўляюцца:

сістэмна – функцыянальны прынцып, які прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання ўсіх узроўняў моўнай сістэмы (фанетыка, лексіка, склад слова і словаўтварэнне, марфалогія, сінтаксіс, арфаграфія, пунктуацыя);

прынцып мінімізацыі тэарэтычнага матэрыялу, які патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач моўнай адукацыі, а таксама асаблівасцей псіхафізічнага развіцця вучняў;

маўленча-камунікатыўны прынцып, які азначае, што працэс навучання трэба забяспечыць адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці (слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);

прынцып уліку псіхафізіялагічных асаблівасцей вучняў, які прадугледжвае выбар вусных і пісьмовых форм працы ў залежнасці ад маўленчых парушэнняў.

Змест навучання беларускай мове мае інтэграваны характар. У адзін курс інтэгруюцца мова і літаратура. Гэта забяспечваецца вывучэннем мовы на аснове тэкстацэнтрычнага падыходу, калі моўныя з’явы разглядаюцца ў мастацкім тэксце, які ў сваю чаргу аналізуецца з боку зместу і выяўленча-мастацкіх сродкаў стварэння вобразаў. Тэкст, з’яўляючыся аб’ектам лінгвістычнага і літаратурнага аналізу, адначасова разглядаецца як сродак навучання мове і літаратуры.

З улікам інклюзіўных тэндэнцый у сучаснай адукацыі змест дадзенай вучэбнай праграмы арыентаваны ў першую чаргу на вучняў з агульным недаразвіццём маўлення розных узроўняў (яны складаюць абсалютную большасць з ліку вучняў).

Адукацыйны працэс павінен быць скіраваны на засваенне зместу агульнай сярэдняй адукацыі на індывідуальна магчымым узроўні ў залежнасці ад асаблівасцей маўленчага і інтэлектуальнага развіцця вучняў. Таму дадзеная вучэбная праграма з’яўляецца адаптаваным варыянтам вучэбнай праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з улікам асаблівасцей псіхафізічнага развіцця вучняў, іх лінгвістычнага вопыту па рускай мове, узроўню практычнага валодання другой (беларускай) мовай.

У прыватнасці, уводзіцца ўступны моўны курс, зняты асобны тэарэтычны матэрыял, складаны для вучняў, прыярытэт аддаецца вусным відам маўленчай дзейнасці; пісьмовыя працы па развіцці маўлення, дыктанты носяць навучальны характар.

Вызначаная колькасць гадзін на вывучэнне раздзелаў і тэм носіць прыкладны характар: педагагічны работнік пры складанні каляндарна-тэматычнага планавання можа самастойна размеркаваць вучэбны час у залежнасці ад ступені падрыхтоўкі класа і складанасці матэрыялу.

Першы год навучання (V клас) з’яўляецца адаптацыйным для вучняў у плане ўспрымання імі беларускай мовы як сацыяльна-культурнай з’явы і як аб’екта вывучэння. Навучанне ў гэты перыяд мае на мэце ў першую чаргу развіццё здольнасцей аўдзіравання (асэнсаванае ўспрыманне на слых тэкстаў на беларускай мове), узбагачэнне слоўнікавага запасу, развіццё фанематычнага слыху, фарміраванне навыкаў чытання і першапачатковых навыкаў пісьма па-беларуску. На першым годзе навучання фарміруецца неабходная лексіка-семантычная і артыкуляцыйна-слыхавая база, што забяспечвае далейшае авалоданне маўленчай дзейнасцю на беларускай мове.

З дадзенай вучэбнай праграмы ў VI і далейшых класах з-за складанасці і збытковасці матэрыялу зняты раздзел «Тэкст», у якім прапаноўваліся тэарэтычныя звесткі пра тэкст, яго структуру, сродкі сувязі, тыпы, стылі і жанры, а гадзіны пераразмеркаваны паміж іншымі граматычнымі раздзеламі і тэмамі, у VII класе – склад слова і словаўтварэнне,

назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, у VIII – дзеяслоў і яго формы (дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе), прыслоўе, службовыя часціны мовы і выклічнік.

Сінтаксіс вывучаецца ў IX–X класах. Аднак першапачатковыя звесткі пра сінтаксіс і пунктуацыю ўводзяцца ўжо ў VI класе. Гэта дазваляе на практыцы забяспечыць вывучэнне марфалогіі на сінтаксічнай аснове.

Работа па развіцці маўлення арганізуецца на кожным уроку, пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай мовы. Асобныя гадзіны на развіццё маўлення па гэтай прычыне не выдзяляюцца.

Асноўная частка дадзенай вучэбнай праграмы складаецца з трох кампанентаў: ведавага (тэарэтычны матэрыял), аперацыйнага (спосабы дзейнасці) і практычнага (уменні і навыкі), што ў сукупнасці і складае змест навучання.

Навучанне беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (у XI–XII класах) мае на мэце фарміраванне асобы вучня як свядомага носьбіта мовы, развіццё яго інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Вучань павінен мець такі ўзровень падрыхтоўкі, які забяспечыць паўнавартаснае выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах яе функцыянавання.

Задачы навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі: сістэматызацыя і паглыбленне ведаў пра мову і маўленне, заканамернасці і правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормы беларускай літаратурнай мовы, удасканаленне культуры вуснага і пісьмовага маўлення (моўная і маўленчая кампетэнцыі); развіццё звязнага маўлення – умення ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні, публічныя выступленні розных тыпаў, стыляў і жанраў (камунікатыўнарытарычная кампетэнцыя); авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культур; удасканаленне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін; сацыякультурнае развіццё вучняў на аснове засваення звычаяў, правіл, норм, якія рэгулююць узаемадзеянне людзей і іх паводзіны ў грамадстве, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў (лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі).

Асноўнай задачай навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі становіцца практычнае засваенне ўсіх асноўных норм беларускай мовы (арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, фразеалагічных, словаўтваральных, марфалагічных, сінтаксічных, арфаграфічных і пунктуацыйных). Валоданне нормамі сучаснай беларускай мовы павінна стаць арганічнай часткай агульнай маўленчай культуры, асноўным паказчыкам якой з’яўляецца правільнае маўленне.

Галоўная мэта навучання – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Дадзеная вучэбная праграма грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, арыентуе на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, эстэтычны і творчы характар навучання беларускай літаратуры, ўзроставаінтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

У арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццеспазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Змест літаратурнай адукацыі ў XI–XII класах пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе пазнаёміць вучняў з літаратурай як мастацтвам

слова ў розныя перыяды і спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з’яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў дадзеную вучэбную праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры. Паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыкабіяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

На заключным этапе літаратурнай адукацыі актуалізуюцца, паглыбляюцца і сістэматызуюцца веды і ўменні, атрыманыя ў папярэдніх класах, што вядзе да сінтэтычнага асэнсавання літаратуры і яе канкрэтных з’яў на светапоглядным, філасофскім, культуралагічным узроўнях, да ўсведамлення вучнем сябе як асобы і маральнага самавызначэння. На гэта скіраваны розныя віды работы. Акрамя традыцыйных формаў урока, шырока практыкуюцца творчыя лабараторыі, праектная дзейнасць, семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і гэтак далей. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з’яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў. Дзеля рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу да навучання літаратуры вучням з аналітычным тыпам мыслення мэтазгодна часцей прапаноўваць заданні творчага характару; вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей даваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэктаваць першапачатковае суб’ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і іншае.

З мэтай развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацкаэстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў пры навучанні беларускай літаратуры мэтазгодна прадугледжваць рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Русская литература», «Гісторыя Беларусі».

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння.

У адукацыйнай практыцы могуць выкарыстоўвацца як традыцыйныя, так і электронныя сродкі навучання, якія павінны быць скіраваны на дасягненне мэт і задач літаратурнай адукацыі.

Прапанаваныя дадзенай вучэбнай праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Педагагічны работнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Гадзіны на творчыя работы педагагічны работнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарным планам.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

V КЛАС (35 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

Наша мова (3 гадзіны)

Алфавіт. Гукі і літары. Літары і, ў, апостраф.

Слуханне і чытанне тэкстаў пра мову (В. Вярба. «Роднае слова», А. Клышка. «Твая мова», Р. Барадулін. «Літары ад А да Я» і іншыя), гутарка па змесце.

Поры года. Восень (4 гадзіны)

Гукі мовы: галосныя і зычныя. Гукі [г], [дз], [дз'], [дж], [ў], [р], [ч]. Склад слова. Націскныя і ненаціскныя склады.

Слуханне і чытанне тэкстаў пра восень (М. Пазнякоў. «Першага верасня», А. Дзеружынскі. «Урадзіла бульба», Я. Купала. «Лістапад» і іншыя), гутарка па змесце.

Наша Радзіма (3 гадзіны)

Сказ. Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Слуханне і чытанне тэкстаў пра Радзіму (У. Караткевіч. «Мая Беларусь», І. Муравейка. «Наш родны край прыгожы самы», П. Броўка. «Не ахапіць яе вачамі...» і іншыя), гутарка па змесце.

Будзем ветлівыя (3 гадзіны)

Дыялог. Словы ветлівасці.

Слуханне і чытанне тэкстаў (Т. Кляшторная. «Ветлівыя словы», В. Вітка. «Чатыры пажаданні», У. Ліпскі. «Дзелавы шафёр» і іншыя), гутарка па змесце.

Святы ў нашым жыцці (3 гадзіны)

Тэкст. Інтанацыя.

Слуханне і чытанне тэкстаў (В. Вітка. «Добры госць», Н. Гілевіч. «Ёлка», П. Марціновіч. «Дзіўны, дзіўны Дзед Мароз», Э. Агняцвет. «Табе жадаю» і іншыя), гутарка па змесце.

Вусная народная творчасць (3 гадзіны)

Словы, якія адказваюць на пытанні хто? ці што?

Слуханне і чытанне прыказак і прымавак, скорагаворак, загадак, заклічак, лічылак, песень, калыханак, гутарка па змесце.

Поры года. Зіма (4 гадзіны)

Словы, якія адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?

Слуханне і чытанне тэкстаў (Д. Бічэль. «Белыя нівы...», І. Грамовіч. «Выпаў снег», В. Рагаўцоў. «І гавораць месяцы…», К. Каліна. «Лыжы» і іншыя), гутарка па змесце.

Народныя святы. Каляды (2 гадзіны)

Слуханне і чытанне тэкстаў пра Каляды (В. Жуковіч. «Калядная вячэра», М. Башлакоў. «Святы вечар» і іншыя), гутарка па змесце.

Поры года. Вясна (4 гадзіны)

Словы, якія адказваюць на пытанні што рабіць? што зрабіць?

Слуханне і чытанне тэкстаў пра вясну (М. Багдановіч. «Перад паводкай», І. Ганчарык. «Першая пралеска», В. Жуковіч. «Сакавіцкі матыў», загадкі М. Сіўца і іншыя), гутарка па змесце.

Маміна свята (1 гадзіна)

Словы, якія адказваюць на пытанні што рабіць? што зрабіць?

Слуханне і чытанне тэкстаў пра 8 Сакавіка (І. Крупеня. «Мамін дзень», Н. Мацяш. «Я промнік сонца ёй злаўлю...» і іншыя), гутарка па змесце.

Народныя святы. Вялікдзень (1 гадзіна)

Словы, якія адказваюць на пытанні што рабіць? што зрабіць?

Слуханне і чытаннетэкстаў пра Вялікдзень (В.Жуковіч. «На Вялікдзень», валачобныя песні і іншыя), гутарка па змесце.

Поры года. Лета (4 гадзіны)

Слуханне і чытанне тэкстаў пра лета (С. Грахоўскі. «Прыходзіць лета звонкае», В. Вярба. «У лесе», А. Дзеружынскі. «Чэрвень», М. Пазнякоў. «Ягады» і іншыя), гутарка па змесце.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць асноўныя адметнасці беларускай мовы; аўтараў, назвы і змест вывучаных твораў; выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы; асноўныя каляндарныя святы; асноўныя літаратурныя жанры і жанры вуснай народнай творчасці;

умець па магчымасці правільна вымаўляць гукі, пры чытанні знаходзіць націскныя склады ў словах; па магчымасці захоўваць інтанацыю пры чытанні; вызначаць сродкі, з дапамогай якіх ствараецца вобразнасць і мілагучнасць; дзяліць тэкст на сказы; выяўляць тыпы сказаў па мэце выказвання і інтанацыі, ставіць адпаведныя знакі прыпынку; распазнаваць часціны мовы (па агульным значэнні і пытанні); адрозніваць маналагічнае і дыялагічнае маўленне; перакладаць з рускай мовы на беларускую асобныя словы і апавядальныя тэксты; адрозніваць вусную і пісьмовую формы маўлення; размяжоўваць гукі і літары, галосныя і зычныя; вызначаць тэму і асноўную думку мастацкага тэксту; прагназаваць змест тэксту па ілюстрацыях; суадносіць паслядоўнасць падзей з малюнкавым радам; вызначаць дзеючых асоб; сцісла і падрабязна перадаваць змест прачытанага твора.

VI КЛАС (70 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35 гадзін)

Мова – найважнейшы сродак зносін (1 гадзіна)

Чалавек і мова. Камунікатыўная функцыя мовы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Успрымаць тэкст на слых і пры чытанні; у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення чытаць тэкст; адказваць на пытанні па змесце тэкстаў.

Тэкст (1 гадзіна)

Тэкст. Прыметы тэксту: тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць. План тэксту.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць тэму, асноўную думку тэксту, даваць яму загаловак, складаць план.

Адрозніваць тэксты-апавяданні, тэксты-апісанні і тэксты-разважанні; пераказваць тэкст па плане.

Сінтаксіс і пунктуацыя (13 гадзін)

Словазлучэнне. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні.

Вылучэнне ў сказах словазлучэнняў, вызначэнне ў іх галоўнага і залежнага слова. Сказ як сінтаксічная адзінка. Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы.

Клічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Будова сказа. Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік. Даданыя члены сказа – дапаўненне, азначэнне, акалічнасць.

Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі), знакі прыпынку. Чытанне тэкстаў, выяўленне сказаў з аднароднымі членамі. Складанне такіх сказаў. Сказы са звароткамі, знакі прыпынку.

Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы. Коска паміж часткамі ў складаным сказе. Простая мова. Дыялог.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Дзяліць тэксты на сказы, называць граматычную аснову.

Карыстацца інтанацыяй для абазначэння межаў сказаў, выяўляць іх тыпы (па мэце выказвання і інтанацыі).

Складаць і ўжываць розныя тыпы сказаў (у тым ліку сказы з аднароднымі членамі і звароткамі), выконваць сінтаксічны разбор сказаў, ставіць знакі прыпынку ў адпаведнасці з вывучанымі правіламі.

Чытаць тэксты, пераказваць іх змест.

Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія (15 гадзін)

Гукі беларускай мовы. Літара як знак гука. Прызначэнне літар е, ё, ю, я, і. Беларускі алфавіт. Назвы літар. Склад. Націск. Правілы пераносу слоў.

Галосныя гукі. Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а; е, ё, я. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў іё (ыё), ія (ыя), іе (ые) у запазычаных словах.

Зычныя гукі. Зычныя глухія, звонкія; цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя. Іх вымаўленне і правапіс.

Мяккі знак і апостраф. Зычныя [д]–[дз'], [т]–[ц'], іх вымаўленне і правапіс. Правапіс у, ў. Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Адрозніваць гукі і літары; правільна вымаўляць гукі і перадаваць іх на пісьме; тлумачыць напісанні слоў з галоснымі і зычнымі, карыстацца арфаграфічным слоўнікам; рабіць элементарны фанетычны разбор слоў.

Захоўваць інтанацыю пры чытанні; пераказваць апавядальныя тэксты.

Лексіка (4 гадзіны)

Лексічнае значэнне слова. Сінонімы. Антонімы. Запазычаныя словы ў беларускай мове.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць лексічнае значэнне слова па слоўніку і ў тэксце; падбіраць да слоў сінонімы і антонімы; карыстацца тлумачальным слоўнікам.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год (1 гадзіна)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Вусная народная творчасць – крыніца літаратуры. Фальклорныя і літаратурныя творы.

Роднае слова (2 гадзіны)

Пятрусь Броўка. «Калі ласка». Любоў да роднай мовы, паказаная ў вершы. Заклапочанасць паэта лёсам роднай мовы. Раскрыццё характару беларуса.

Яўгенія Янішчыц. «Мова». Эпітэты, якімі аўтар называе родную мову. Эмацыянальная выразнасць паэтычных радкоў.

Мастацтва[1]. Жывапіс: В. Цвірка. «Мая Радзіма»; М. Ісаёнак. «Песня аб маёй зямлі»; В. Бяляўскі. «Беларускі краявід» і іншыя.

[1] Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца на выбар педагагічнага работніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Вусная народная творчасць (10 гадзін)

Народныя казкі. «Разумная дачка» – бытавая казка. Вобразы мужыка, пана, багацея і яго жонкі. Дыялог пана і дзяўчынкі. Фантазія і рэальнасць у казцы. Гумар у творы. «Залаты птах» – чарадзейная казка. Працавітасць, смеласць, дабрыня і спагадлівасць у казцы. Супрацьстаянне дабра і зла. Вобраз галоўнага героя. Перабольшанне пры характарыстыцы персанажа. «Музыкі» – казка пра жывёл. Характарыстыка казачных герояў – асла, сабакі, ката і пеўня. Сіла сяброўства ў пераадоленні жыццёвых нягод. Парадак дзеяння ў казцы пра жывёл.

Легенды. «Нарач». Гісторыя паходжання возера. Фантастычнае і чароўнае ў легендзе аб Найрыце. Паэтызацыя прыгажосці, душэўнай чысціні, вернасці ў каханні. Маральная перавага Найрыты над панам. «Пестунь». Бытавыя і сацыяльныя рэаліі ў творы. Вобразы твора. Павучальны змест легенды.

Загадкі. Народныя загадкі. Тэматычнае багацце загадак. Паэтычныя загадкі, загадкі-задачы. Іншасказальны характар загадак.

Прыказкі. Увасабленне ў прыказках мудрасці народа. Павучальны змест прыказак. Пераносны сэнс у прыказках. Лаканізм, трапнасць і дакладнасць мовы.

Прыкметы і павер’і. Функцыі прыкмет і павер’яў. Прыкметы, звязаныя з прыродай. Павер’і беларускага народа. Блізкасць прыкмет і павер’яў да загадак, казак, легенд, прыказак.

Мастацтва. Беларускія легенды, казкі ў творах мастакоў А. Александровіча, А. Навіцкага, Ю. Зайцава, В. Валынца, У. Гладкевіча і іншых; мультфільмы, тэатральныя, тэле- і радыёспектаклі па легендах, казках.

Літаратурныя казкі і легенды (4 гадзіны)

Максім Танк. «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы «Нарач»). Легенда і паэма пра возера: падобнае і адрознае. Паэтызацыя вернасці ў каханні. Вобразы Галіны і Васіля. Вобраз магната Барыны. Парадак дзеяння ў творы (сюжэт).

Уладзімір Караткевіч. «Нямоглы бацька» (у скарачэнні). Шанаванне мудрасці і вопыту бацькоў, выхаванне ўдзячнасці, павагі, уважлівасці і міласэрнасці да іх. Адносіны апавядальніка да герояў і падзей, апісаных у творы. Элементы народнай казкі.

Выразнасць мастацкага слова (1 гадзіна)

Максім Багдановіч. «Зімой». Паэтычны зварот да зімовага вечара. Настрой, перададзены ў творы. Яркія вобразы прыроды. Знакі прыпынку ў вершы.

Мастацтва. Жывапіс: Ф. Рушчыц. «Зімовая казка»; В. Цвірка. «Беларускі пейзаж» і іншыя.

Літаратурны твор – непадзельнае мастацкае адзінства (10 гадзін)

Якуб Колас. «У старых дубах». Тэма сяброўства ў творы. Сяброўства Грышкі і Базыля. Характар Базыля. Неабдуманы ўчынак Грышкі. Парадак дзеяння ў творы (сюжэт).

Максім Лужанін. «Добры хлопец Дзік» (урыўкі). Тэма чалавека і прыроды ў творы. Вобразы жывёл, адносіны людзей да іх. Гумар у творы. Адносіны апавядальніка да жывых істот. Парадак дзеяння ў частках твора (сюжэт).

Генрых Далідовіч. «Страта» (урыўкі). Тэма чалавечнасці ў творы. Лёс Міці Бокуця. Змена ў адносінах Стасіка да Міці. Чуласць, міласэрнасць, спачуванне у сяброўстве. Вучні і іх учынкі ў творы. Адметнасць будовы апавядання.

Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі» (скарочана). Тэма чалавека і прыроды ў творы. Выяўленне духоўнай шчодрасці чалавека ў клопатах аб прыродзе. Гісторыя Бурыка. Сувязь жыцця людзей з жыццём прыроды.

Мастацтва. Жывапіс: У. Зінкевіч. «Шчасце мірнага дня»; С. Гарачаў. «Дзяцінства»; М. Селяшчук. «А раптам гэта ўзнікне перад табой?».

Прыгоды і падарожжы (4 гадзіны)

Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (урыўкі). Прыгодніцкі характар аповесці. Роля гумару ў выяўленні адносін апавядальніка да байцоў і іх любімцаў: Мішкі, Жука, Барадатага.

Рэзерв вучэбнага часу (2 гадзіны)

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў для завучвання на памяць Пятрусь Броўка. «Калі ласка». Максім Багдановіч. «Зімой».

Спіс твораў для мастацкага расказвання. Беларуская народная або літаратурная казка (на выбар педагагічнага работніка).

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага, фальклорнага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне;

выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх, фальклорных твораў розных жанраў;

складанне планаў розных відаў (падрабязны і іншыя);

аналіз твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей; супастаўленне мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму (адказаў на праблемныя пытанні, кароткіх паведамленняў) з выкарыстаннем некалькіх крыніц;

ілюстраванне мастацкага твора;

выкананне творчых заданняў па літаратуры (складанне ўласных загадак, заклічак і іншае).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць аўтараў, назвы і змест праграмных твораў; тэарэтыка-літаратурныя паняцці (на ўзроўні азнаямлення) у аб'ёме, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць і мастацкага расказвання;

умець выконваць аналіз мастацкага твора (на элементарным узроўні); выказваць уласнае меркаванне пра вывучаныя творы і абгрунтоўваць яго; выконваць пісьмовыя работы (міні-сачыненне паводле плана); рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў (разгорнуты адказ на пытанне); выконваць творчыя заданні па літаратуры; карыстацца рознымі тыпамі крыніц інфармацыі.

VII КЛАС (70 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35 гадзін)

Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа (1 гадзіна)

Літаратурная мова і народныя гаворкі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Чытаць і пераказваць тэксты на тэму «Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа».

Тэкст (1 гадзіна)

Тэкст і яго асноўныя прыметы: тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць (спосабы і сродкі сувязі), завершанасць (паўтарэнне). Падтэмы тэксту. Ключавыя (апорныя) словы і сказы ў тэксце.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць прыметы тэксту, тыпы маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).

Вызначаць прыметы тэксту, тэму і асноўную думку тэксту, даваць яму загаловак; дзяліць на лагічныя часткі, вызначаць апорныя словы і сказы.

Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія (7 гадзін)

Марфемная будова слова. Аснова і канчатак. Корань слова.

Аднакаранёвыя словы.

Прыстаўка і суфікс як значымыя часткі слова.

Чаргаванне зычных і галосных у аснове. Пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую.

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны. Правапіс і, й, ы пасля прыставак. Чытанне тэкстаў, выяўленне ў іх аднакаранёвых слоў.

Утварэнне слоў. Спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны; складанне слоў і асноў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць значымыя часткі слова – марфемы; спосабы ўтварэння слоў.

Выдзяляць у словах значымыя часткі – марфемы, аснову, рабіць словаўтваральны разбор, разбіраць словы па саставе, графічна абазначаць марфемы.

Адрозніваць спосабы ўтварэння слоў, адрозніваць аднакаранёвыя словы.

Карыстацца марфемным і словаўтваральным слоўнікамі.

Рабіць пераклад невялікіх тэкстаў з рускай мовы на беларускую, захоўваючы змест і моўныя асаблівасці; вусны пераказ апавядальнага тэксту.

Марфалогія і арфаграфія

Назоўнік (12 гадзін)

Назоўнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Агульныя і ўласныя назоўнікі. Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя.

Род назоўнікаў. Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Лік назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Скланенне назоўнікаў. Асновы назоўнікаў. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (у давальным і месным склонах адзіночнага ліку). Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (у родным і месным склонах адзіночнага ліку). Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (у творным склоне

адзіночнага ліку). Правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (у родным і творным склонах).

Спосабы ўтварэння назоўнікаў. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі -ак, -ык, -ік, -ачк-, -ечк-; мяккі знак перад суфіксамі -к-, -чык- і ў суфіксах -аньк-, -еньк-. Складаныя назоўнікі, іх правапіс. Правапіс не (ня), ні з назоўнікамі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, ролю назоўнікаў, асаблівасці правапісу назоўнікаў 1-га, 2-га і 3-га скланенняў, правапіс суфіксаў і канчаткаў назоўнікаў; ведаць спосабы ўтварэння назоўнікаў.

Распазнаваць назоўнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах; абгрунтоўваць правапіс суфіксаў і канчаткаў назоўнікаў; скланяць назоўнікі.

Правільна ўтвараць і ўжываць у маўленні назоўнікі розных лексікасемантычных груп.

Складаць сказы з назоўнікамі пэўных семантычных груп.

Прыметнік (6 гадзін)

Прыметнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

Прыметнікі з суфіксам -ск-, іх правапіс. Правапіс -н-, -нн- у прыметніках.

Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў. Правапіс не (ня) з прыметнікамі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, ролю прыметнікаў, асаблівасці скланення прыметнікаў, асноўныя спосабы іх ўтварэння, правапіс прыметнікаў.

Распазнаваць прыметнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах; правільна ўтвараць прыметнікі з суфіксам -ск-; скланяць прыметнікі.

Лічэбнік (5 гадзін)

Лічэбнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лічэбнікі колькасныя і парадкавыя.

Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю лічэбнікаў, падзел лічэбнікаў паводле значэння, граматычных прымет і складу, правапіс лічэбнікаў.

Распазнаваць лічэбнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах; адрозніваць колькасныя, парадкавыя простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі; скланяць лічэбнікі.

Правільна ўтвараць склонавыя формы колькасных лічэбнікаў; правільна вымаўляць і пісаць лічэбнікі ад адзінаццаці да дзевятнаццаці, а таксама пяцьдзясят, шэсцьдзясят, семдзесят, восемдзесят; спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі два, дзве, тры; чатыры; правільна карыстацца лічэбнікамі пры абазначэнні даты, свята, прыблізнай колькасці.

Пераказваць апавядальны тэкст.

Займеннік (2 гадзіны)

Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Змяненне асабовых займеннікаў і іх правапіс.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю займеннікаў, правапіс займеннікаў.

Распазнаваць займеннікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах; правільна вымаўляць і пісаць.

Правільна ўтвараць і ўжываць займеннікі розных разрадаў ва ўласным маўленні; выкарыстоўваць асабовыя займеннікі ў адпаведнасці з этычнымі нормамі.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год (1 гадзіна)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Кніга адкрывае свет (1 гадзіна)

Кніга – мудры дарадца чалавека. Эпізоды з гісторыі беларускай кнігі.

Родная зямля. Народ. Мой род (2 гадзіны)

Пятрусь Броўка. «Зямля Беларусі» (урывак з паэмы «Беларусь»). Галоўная думка твора: услаўленне беларускай зямлі, яе мінулага і велічы. Словы, якія паказваюць любоў да радзімы. Апісанне непаўторнай прыгажосці роднай прыроды. Славутыя мясціны Беларусі ў творы.

Алесь Пісьмянкоў. «Продкі». Галоўная думка твора: памяць пра мінулыя пакаленні – духоўная аснова чалавека. Услаўленне паэтам моцы, мужнасці і працавітасці продкаў, іх песеннай душы. Запавет продкаў не сеяць зло.

Мастацтва. Жывапіс: «Мая зямля. Жывапіс беларускіх мастакоў» (альбом). Фотамастацтва: Г. Ліхтаровіч «Добры дзень, Беларусь» (альбом).

Фальклор і літаратура (7 гадзін)

Міфы і легенды.Народная легенда. «Дамавікова ўдзячнасць». Легенда на аснове міфалагічнага сюжэта пра вужа-дамавіка. Уяўленне нашых продкаў пра справядлівасць і спагаду. Парадак падзей у творы (сюжэт). Характарыстыка персанажаў твора: жыццёвая мудрасць гаспадара, легкадумнасць дзяцей, удзячнасць вужа-дамавіка, помслівасць гадзюкі. Галоўная думка твора: і самы люты звер за дабро дабром дзякуе.

Ян Баршчэўскі. «Вужыная карона». Літаратурны твор на аснове міфалагічнага сюжэта пра вужыную карону. Лёс лоўчага Сямёна. Вобраз незнаёмага – прадстаўніка злых сіл. Сапраўднае і выдуманае ў тэксце. Эмоцыі і пачуцці, выражаныя ў розных частках тэксту. Галоўная думка твора: што без працы атрымаў, тое да дабра не давядзе.

Беларуская песня:

каляндарна-абарадавыя песні. «Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...», «Благаславі, маці, вясну заклікаці...», «А на Купалу рана сонца іграла...». Уяўленне продкаў пра прыроду як жывую істоту. Народныя святы, абрады, звычаі і іх удзельнікі. Рытмічнасць народных песень. Сродкі мастацкай выразнасці: радкі падобнай будовы, паўторы, памяншальналаскальныя словы.

сямейна-абрадавыя песні. «Каля месяца, каля яснага...», «А ў суботу проці нядзелі…», «Рэчанька». Сувязь песень з этапамі жыццёвага шляху чалавека ад нараджэння да апошніх дзён. Народныя абрады і звычаі ў песнях, іх удзельнікі. Мэта песень – абараніць чалавека ад злога, спрыяць шчасліваму жыццю. Сродкі мастацкай выразнасці: звароты, радкі падобнай будовы, паўторы, памяншальна-ласкальныя словы.

Алесь Ставер. «Жураўлі на Палессе ляцяць» – адна з песенных візітак Беларусі. Галоўная думка твора: родная зямля сэрцу даражэй за чужыя. Апяванне красы родных краявідаў. Урачыстасць гучання верша праз доўгія радкі. Асаблівасць будовы верша (кампазіцыя). Музычнае ўвасабленне твора ансамблем «Песняры» (музыка І. Лучанка).

Мастацтва. Музыка: І. Лучанок. «Жураўлі на Палессе ляцяць» (словы А. Ставера); творы І. Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры.

Мастацкае слова: вобразнасць, выразнасць, хараство (2 гадзіны)

Паўлюк Трус. «Падаюць сняжынкі...» (урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»). Хараство зімовага пейзажу. Агульны настрой твора. Выяўленне пачуццяў светлай тугі, замілаванасці роднымі вобразамі ва ўспамінах героя. Словы з пераносным значэннем у апісанні карцін, паказаных у тэксце. Асаблівасці паэтычнага радка.

Рыгор Барадулін. «Уцякала зіма ад вясны». Тэма прыроды ў вершы. Казачныя элементы верша: адухаўленне пор года. Карціны прыроды, створаныя паэтам. Будова верша (кампазіцыя): паўторы радкоў. Багацце тэксту на дзеясловы.

Мастацтва. Жывапіс: Ф. Рушчыц. «Вясна»; В. Бялыніцкі-Біруля. «Зімовы сон», «Веснавы дзень»; У. Кудрэвіч. «Раніца вясны»; П. Крахалёў. «Блакітная вясна»; П. Масленікаў. «Зацвіло жыта»; Ф. Дарашэвіч. «У пойме ракі Бярэзіны»; С. Каткоў. «Хутар Альбуць»; І. Карасёў. «Залатая восень»; В. Цвірка. «Верасень»; А. Бараноўскі. «Воблакі плывуць над зямлёй роднай». Музыка: І. Лучанок. «Падаюць сняжынкі...» (словы П. Труса). Фотамастацтва: В. Алешка. «Пакланіся прыродзе» (альбом); С. Плыткевіч. «Спатканне з лесам» (альбом); «Мая Беларусь» (альбом).

Літаратура як чалавеказнаўства (7 гадзін)

Алена Васілевіч. «Сябры». Тэма ўзаемаадносін паміж людзьмі, сяброўства. Маральна-этычная праблема твора. Змены ва ўзаемаадносінах Лёні і Грышы. Хвароба Лёні як вынік легкадумнага ўчынку сябра. Выхаваўчае значэнне тэксту. Будова апавядання (адна сюжэтная лінія). Кузьма Чорны. «Насцечка» (урыўкі). Тэма гуманнасці, высакароднасці, сумленнасці. Час, у які адбываецца дзеянне; прыкметы часу ў творы. Галоўныя героі аповесці – Насцечка і Серж, супрацьлегласць іх учынкаў і паводзін. Другарадныя героі і іх характары. Адметнасць будовы аповесці ў адрозненне ад апавядання (некалькі сюжэтных ліній).

Тэмы і вобразы мастацкай літаратуры (13 гадзін)

Гістарычная тэма.

Уладзімір Бутрамееў. «Славутая дачка Полацкай зямлі». Этапы аповеду летапіснай гісторыі пра Уладзіміра і Рагнеду. Сваяцкія адносіны паміж героямі твора. Характар Рагнеды: пачуццё годнасці, непакорлівасць, смеласць. Характар Уладзіміра і звычаі даўніх часоў. Учынак Ізяслава, яго адносіны да маці. Месца гарадоў, згаданых у летапіснай гісторыі, на сучаснай карце.

Іван Саверчанка. «Векавая мудрасць» (урывак з легенды «Скарб крывічоў»). Месца і час дзеяння, адлюстраваныя ў творы. Адметнасць асабовых імёнаў герояў твора, назвы даўніх плямёнаў. Вобразы князя, яго дачкі і кніжнікаў. Старажытныя тэхналогіі вырабу кніг. Элементы легенды аб продках ва ўрыўку. Каштоўнасць ведаў і навук для нашых папярэднікаў.

Ваенная тэма.

Аляксей Пысін. «Проня». Галоўная думка верша: няскоранасць народнага духу. Вобраз зняволенай беларускай ракі, якой чужынцы ўчыняюць допыт. Элементы народных казак: адухаўленне ракі, наданне ёй гераічных рыс характару (вольналюбства, смеласці, мужнасці), трохразовы паўтор дыялогу. Параўнанне ўчынкаў ворагаў і абаронцаў Радзімы. Асаблівасці будовы: двухрадковыя строфы, супрацьпастаўленне частак пра чужынцаў і нашых салдат.

Анатоль Вярцінскі. «Два полі». Галоўная думка верша: смутак аб воінах, што загінулі. Вобраз салдата, яго трагічны лёс. Задушэўнасць і пранікнёнасць гучання твора. Эмацыянальная стрыманасць і лаканізм апісанняў, запаволены тэмп. Будова верша (кампазіцыя): паўтор першай страфы, супрацьпастаўленне мірнага і ратнага поля. Музычнае ўвасабленне твора ў песні ансамбля «Сябры» (музыка Э. Ханка).

Экалагічная тэма.

Пімен Панчанка. «Сармацкае кадзіла». Галоўная думка верша: людзям неабходна зберагчы «зялёную радню» для наступных пакаленняў. Трывожны роздум аб безабароннай прыродзе, знявечанай чалавекам. Запозненае раскаянне чалавека за свае

ўчынкі. Згадванне аўтарам рэдкіх жывёл; раслін, занесеных у Чырвоную кнігу. Словы, якія ўказваюць на віну чалавека ў бедах прыроды. Сродкі выразнасці: мастацкія азначэнні, выразы з пераносным значэннем.

Іван Пташнікаў. «Алені» (урывак «Восень у Бярэзаўцы»; да слоў «Больш Ірка не бачыла «сваіх» аленяў аж да зімы»). Тэма чалавека і прыроды ў творы. Майстэрства пісьменніка ў стварэнні яркіх, маляўнічых карцін восеньскага лесу. Вобраз дзяўчынкі Іркі. Паказ насельнікаў лесу. Суладны свет прыроды і разбуральная дзейнасць людзей, вайна. Словы – мастацкія азначэнні (эпітэты).

Янка Маўр. «Багіра». Тэма любові да ўсяго жывога ў творы. Жыццёвая аснова апавядання. Гісторыя Багіры і яе кацянят, надзяленне коткі якасцямі чалавека. Адносіны да кашэчай сям'і дарослых і дзяцей. Займальнасць і дынамізм сюжэта. Асоба апавядальніка ў творы, яго стаўленне да расказанага.

Алегарычныя і сатырычныя вобразы (1 гадзіна)

Алесь Звонак. «Гарбуз»; Якуб Колас. «Конь і сабака» (на выбар педагагічнага работніка). Байка як павучальны вершаваны аповед. Сюжэт байкі, яе іншасказальны (алегарычны) змест. Характары людзей, паказаныя праз вобразы раслін і жывёл. Высмейванне чалавечых заган (зазнайства, самаўпэўненасці, ганарыстасці). Выкрыццё ўяўнай смеласці і дужасці. Роля параўнанняў у паказе паводзін герояў. Мараль байкі і яе значэнне ў выяўленні аўтарскай задумы.

Мастацтва. Жывапіс: А. Сцяпанаў. «Цугам»; М. Савіцкі. «Поле»; В. Бялыніцкі-Біруля. «Зноў зацвіла вясна»; В. Юркоў. «Апошнія яблыкі»; Ф. Янушкевіч. «Рагнедзін лёс. Сцяна памяці». Музыка: Э. Ханок. «Два полі» (словы А. Вярцінскага).

Рэзерв вучэбнага часу (1 гадзіна)

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў длязавучвання на памяць і мастацкага расказвання: Алесь Пісьмянкоў. «Продкі». Алесь Ставер. «Жураўлі на Палессе ляцяць». Паўлюк Трус. «Падаюць сняжынкі…» (урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»). Анатоль Вярцінскі. «Два полі».

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне;

выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх твораў розных жанраў; складанне планаў розных відаў (падрабязны і кароткі);

аналіз літаратурнага твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей;

супастаўленне мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва;

напісанне міні-сачыненняў паводле прапанаванага плана;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму (адказаў на праблемныя пытанні, кароткіх паведамленняў, іншых выступленняў) з выкарыстаннем некалькіх крыніц;

выкананне творчых заданняў па літаратуры (ілюстраванне твораў, іншыя заданні).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць аўтараў, назвы і змест праграмных твораў; тэарэтыка-літаратурныя паняцці (на ўзроўні азнаямлення) у аб'ёме, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

умець выконваць аналіз мастацкага твора (на элементарным узроўні); выказваць уласнае меркаванне пра вывучаныя творы і абгрунтоўваць яго; выконваць пісьмовыя работы (міні-сачыненне паводле прапанаванага плана, табліцы); рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў; выконваць творчыя заданні па літаратуры; карыстацца рознымі тыпамі крыніц інфармацыі.

VIII КЛАС (70 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35гадзін)

Валоданне літаратурнай мовай – асноўны паказчык культуры чалавека (1 гадзіна)

Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Маўленчы этыкет.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць асноўныя нормы сучаснай беларускай мовы, правілы маўленчага этыкету. Захоўваць нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы ва ўласным маўленні.

Паўтарэнне вывучанага ў V–VII класах (1 гадзіна)

Назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік як часціны мовы, іх граматычныя прыметы.

Будова слова. Словаўтварэнне вывучаных часцін мовы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Распазнаваць у тэксце назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, даваць іх граматычную характарыстыку. Вызначаць граматычныя прыметы вывучаных часцін мовы.

Карыстацца марфалагічнымі моўнымі сродкамі для стварэння ўласных выказванняў.

Тэкст (1 гадзіна)

Тэкст і яго асноўныя прыметы (паглыбленае паўтарэнне). Віды сувязі: паслядоўная і паралельная; сродкі сувязі сказаў у тэксце.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць прыметы тэксту. Вызначаць прыметы тэксту, спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту.

Дзеяслоў (8 гадзін)

Дзеяслоў як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс не (ня) з дзеясловамі.

Неазначальная форма дзеяслова.

Трыванні дзеяслова. Лад дзеяслова. Правапіс дзеясловаў з суфіксамі -ава- (ява), -ыва- (-іва-), -ва-, -оўва- (-ёўва-).

Часы дзеяслова, утварэнне і ўжыванне часавых формаў дзеяслова.

Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў. Спосабы ўтварэння дзеясловаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеясловаў. Распазнаваць дзеясловы ў тэксце.

Правільна пісаць дзеясловы ўмоўнага ладу (чытаў бы, чытала б), суфіксы -ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва-, -оўва- (-ёўва-) у дзеясловах, асабовыя канчаткі дзеясловаў, не (ня) з дзеясловамі.

Правільна ўтвараць і ўжываць дзеясловы ў маўленні.

Пераказваць тэкст з ужываннем адпаведных форм дзеяслова.

Дзеепрыметнік (6 гадзін)

Дзеепрыметнік як форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку.

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і ўжыванне. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу -н-, -ен-, -ан-, -т-.

Правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеепрыметнікаў; правілы ўтварэння, напісання дзеепрыметнікаў, выдзялення дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў знакамі прыпынку.

Распазнаваць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты; утвараць розныя формы дзеепрыметнікаў.

Правільна скланяць і пісаць склонавыя канчаткі дзеепрыметнікаў, суфіксы дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу -н-, -ен-, -ан-, -т; не (ня) з дзеепрыметнікамі.

В выдзяляць знакамі прыпынку дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты ў становішчы пасля слова, якое дзеепрыметнік паясняе, перад асабовым займеннікам.

Правільна ўжываць дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу ва ўласным маўленні; складаць і інтанаваць сказы з дзеепрыметнікавымі зваротамі.

Перакладаць з рускай мовы на беларускую мову тэксты з элементамі апісання знешнасці чалавека; складаць мастацкае апісанне знешнасці чалавека па апорных словах.

Дзеепрыслоўе (4 гадзіны)

Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс не (ня) з дзеепрыслоўямі.

Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку.

Дзеепрыслоўі незаконченага і закончанага трывання, іх утварэнне і правапіс.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеепрыслоўяў; правілы ўтварэння, напісання дзеепрыслоўяў, выдзялення дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў знакамі прыпынку.

Распазнаваць у тэксце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты; утвараць розныя формы дзеепрыслоўяў (закончанага і незакончанага трыванняў).

Правільна пісаць суфіксы дзеепрыслоўяў закончанага (-шы, -ўшы) і незакончанага трыванняў (-ачы (-ячы), -учы (-ючы)), не (ня) з дзеепрыслоўямі. Правільна ўжываць дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання ва ўласным маўленні; інтанаваць сказы з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Рабіць выбарачны вусны пераказ тэкстаў з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Прыслоўе (6 гадзін)

Прыслоўе як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў па значэнні (практычна).

Утварэнне прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў разам, праз дэфіс.

Правапіс не (ня), ні з прыслоўямі. Навучальны падрабязны пераказ тэксту.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю прыслоўяў, асноўныя спосабы ўтварэння прыслоўяў, іх правапіс.

Распазнаваць у тэксце прыслоўі. Правільна пісаць прыслоўі разам і праз дэфіс, пісаць асобна спалучэнні, блізкія да прыслоўяў, не (ня), ні з прыслоўямі.Дарэчы ўжываць прыслоўі ў тэксце.

Рабіць падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю.

Службовыя часціны мовы і выклічнік. Прыназоўнік (2 гадзіны)

Прыназоўнік як службовая часціна мовы.

Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх ужыванне і правапіс.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю прыназоўнікаў, правапіс прыназоўнікаў разам, праз злучок і асобна.

Распазнаваць у тэксце прыназоўнікі; адрозніваць прыназоўнікі ад самастойных часцін мовы.

Правільна пісаць вытворныя прыназоўнікі, складаныя прыназоўнікі праз злучок.

Правільна ўжываць прыназоўнікі для перадачы розных сэнсавых адносін у сказе і тэксце, у тым ліку прыназоўнікі з (са), у (ва), па, згодна з, дзякуючы, падобна, адпаведна і іншыя; выкарыстоўваць спецыфічныя для беларускай мовы спалучэнні прыназоўнікаў з назоўнікамі, займеннікамі (у тым ліку пры перакладзе з рускай мовы).

Злучнік (2 гадзіны)

Злучнік як службовая часціна мовы.

Простыя і састаўныя злучнікі, іх ужыванне.

Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю злучнікаў, разрады злучнікаў па будове, ужыванні і значэнні; напісанне злучнікаў разам і асобна.

Распазнаваць злучнікі ў тэкстах.

Правільна ўжываць злучнікі ў сказах з аднароднымі членамі, у складаных сказах і для сувязі сказаў і частак тэксту; складаць тэксты з ужываннем розных злучнікаў.

Дзяліць тэкст на сказы паводле граматычнай будовы.

Часціца (2 гадзіны)

Часціца як службовая часціна мовы. Правапіс часціц.

Часціцы не, ні, іх адрозненне. Правапіс не (ня), ні з рознымі часцінамі мовы (практычна).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю часціц.

Распазнаваць часціцы ў тэксце; складаць з імі сказы, ужываць у маўленні; захоўваць правільную інтанацыю пры чытанні сказаў з часціцамі; рабіць марфалагічны разбор часціцы.

Выклічнік (1 гадзіна)

Выклічнік як часціна мовы. Дэфіс у выклічніках. Знакі прыпынку ў сказах з выклічнікамі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы выклічніка.

Распазнаваць выклічнікі ў тэксце, вызначаць іх ролю; адрозніваць выклічнікі ад гукапераймальных слоў; правільна чытаць сказы з выклічнікамі, самастойна складаць новыя; ужываць выклічнікі ў маўленні.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год (1 гадзіна)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Паэтычная і празаічная літаратурныя формы. Жанры паэзіі (верш), прозы (апавяданне, аповесць). Жанры, якія сумяшчаюць абедзве формы (байка).

Літаратура – мастацтва слова (1 гадзіна)

Якуб Колас. «У яго быў свет цікавы...» (урывак з паэмы «Сымонмузыка»). Паэма як вялікі паэтычны твор. Вобраз героя паэмы Сымонкі. Незвычайна адораная натура хлопчыка, яго бачанне свету. Прычыны адзіноты героя. Свет прыроды ў творы, яго значэнне для хлопчыка. Адносіны аўтара да «не падобнага да другіх» героя, яго аўтарская характарыстыка. Праблема паразумення з людзьмі, не падобнымі да іншых.

Мастацтва. Музыка: В. Іваноў. Музычная паэма «Сымон-музыка» (для аркестра беларускіх народных інструментаў); Л. Шлег. Сімфанічная паэма «Сымон-музыка».

Тэатральнае мастацтва: спектакль «Сымонмузыка» (дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы», рэжысёр М. Пінігін).

Вершаваныя і празаічныя мастацкія творы (5 гадзін)

Якуб Колас. «Ручэй». Пейзаж у вершы: апісанне ручая. Мова вершаванага твора: эмацыянальнасць, рытмічнасць. Сродкі выражэння эмоцый (памяншальна-ласкальныя словы, дзеясловы). Адухаўленне вобразаў прыроды ў вершы. Замілаванне аўтара прыгажосцю роднай прыроды.

Тарас Хадкевіч. «Крынічка». Пейзаж у апавяданні: апісанне крынічкі. Мова празаічнага твора: элементы падзейнасці, разгорнутасць, канкрэтнасць апісанняў, увага да дэталяў, нетаропкасць, разважлівасць аповеду, роўнасць інтанацыі. Наяўнасць пэўных падзей, разгорнутых у часе.

Васіль Зуёнак. «З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...». Тэма мацярок, якія страцілі сыноў падчас вайны, у паэзіі. Абагульнена-эмацыянальнае раскрыццё тэмы ў вершы. Настрой, перададзены ў творы, сродкі яго перадачы (недаказ). Выяўленне бясконцага гора маці праз успаміны, перажыванні, дзеянні. Страфічная арганізацыя верша (слупкі), рытмічнасць мовы.

Васіль Быкаў. «Незагойная рана» (скарочана). Тэма мацярок, якія страцілі сыноў падчас вайны, у прозе. Драматычны змест твора. Вобраз маці (знешняе аблічча (партрэт), матывы ўчынкаў, лад жыцця). Нясцерпная туга старой Тэклі па сыне; сродкі яе перадачы: разгортванне гісторыі ў часе, падрабязнае апісанне жыцця і побыту, паводзін. Асаблівасці кампазіцыі: роля ўспамінаў, сну аб вяртанні Васілька з вайны, пейзажных замалёвак. Свабодная нерыфмаваная мова прозы.

Мастацтва. Музыка: М. Чуркін. «Ручэй» (словы Я. Коласа); Ю. Семяняка. «Нашы маці» (словы А. Бачылы). Жывапіс: М. Залозны. «Салдаткі».

Ідэйна-тэматычная разнастайнасць паэтычных твораў (6 гадзін)

Максім Багдановіч. «Маёвая песня» («Па-над белым пухам вішняў...»). Майстэрства Максіма Багдановіча ў перадачы прыгажосці навакольнага свету. Зрокавыя і слыхавыя асацыяцыі ў вершы. Мастацкія азначэнні ў вершы (эпітэты). Рыфмаваныя радкі ў творы: крыжаваная рыфма. Музычнасць, рытмічнасць гучання твора, яго ўвасабленне ў песні на музыку І. Паліводы.

Данута Бічэль. «Роднае слова». Прызнанне ў любові да роднага краю, роднай мовы. Узнёслы настрой верша. Эпітэты і параўнанні ў творы, іх роля ў раскрыцці вобраза радзімы. Наданне вобразу краю рыс жывой істоты (адухаўленне). Рыфмаваныя радкі ў творы: парная рыфма.

Еўдакія Лось. «Дзяўчаты мінулай вайны». Вайна як час «будзённага гераізму»: апісанне рэалій ваеннага жыцця ў творы. Стаўленне аўтара да гераінь твора, паказ трагізму, бесчалавечнасці вайны. Дзеясловы ў раскрыцці збіральнага вобраза «дзяўчыны на вайне». Мастацкія азначэнні (эпітэты) і словы, да якіх яны адносяцца. Рыфмаваныя радкі ў творы:

крыжаваная рыфма.

Ніл Гілевіч. «Маці». Разгорнутае паэтычнае апяванне любові да маці. Вобраз маці, яе роля ў жыцці дзяцей. Эмацыянальнае апісанне маці праз пачуцці сына. Форма верша-

ўспаміна, задушэўнасць звароту да маці. Звароты ў вершы (рукі маці, вочы маці і іншыя), іх значэнне. Трапныя эпітэты.

Якуб Колас. «Дзядзька-кухар» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Час, паказаны ў паэме, і адпаведныя асаблівасці лексікі. Парадак падзей у тэксце. Майстэрства паэта ў абмалёўцы характару дзядзькі Антося, выяўленне яго душэўнай дабрыні, чуласці, вынаходлівасці, педагагічнага таленту. Камічнасць сітуацый. Інтанацыйная разнастайнасць ў творы. Рыфмаваныя радкі ў творы: парная рыфма.

Мастацтва. Музыка: І. Палівода. «Па-над белым пухам вішняў» (словы М. Багдановіча). Жывапіс: І. Рэй. «З вогненнай вёскі»; М. Савіцкі. «Лічбы на сэрцы»: альбом; І. Давідовіч. «Вершы»; Л. Ран. «Дзядзька Антось».

Адлюстраванне жыцця ў празаічных творах (12 гадзін)

Змітрок Бядуля. «На Каляды к сыну». Час, паказаны ў апавяданні, і адпаведныя асаблівасці лексікі. Маральна-этычныя праблемы: бацькі і дзеці, адрачэнне ад сваіх каранёў. Вобраз старой Тэклі: раскрыццё аўтарам яе характару, думак і перажыванняў. Вобраз Лаўрука: выразныя дэталі ў яго абмалёўцы. Сюжэтная лінія, нетаропкасць аповеду, значэнне фіналу твора. Сувязь пейзажу і падзей у тэксце. Выразнасць эпітэтаў, багацце мовы на народныя выслоўі.

Іван Навуменка. «Настаўнік чарчэння». Тэма дарослых і дзяцей у творы. Галоўная думка твора: асоба настаўніка вызначальная ў фарміраванні жыццёвых перакананняў вучняў. Вобраз настаўніка чарчэння: партрэт, учынкі, паводзіны. Вобраз Косці Кветкі: апісанне, учынкі, паводзіны. Перадача ў вобразе Косці Кветкі ідэі настаўніка – любіць сваю Радзіму і быць гатовым пастаяць за яе. Гаваркія імёны ў творы (Апалінарый – «прадказальнік лёсаў», Феакціст – «заснавальнік, сейбіт», Кветка – тое, што пасеяна і прарасло). Сюжэт твора, фінал апавядання. Кампазіцыйныя часткі.

Мікола Лупсякоў. «Мэры Кэт» (скарочана). Праблема ўзаемаадносін паміж людзьмі. Тэма першага кахання. Галоўны герой твора – апавядальнік. Адлюстраванне жыцця ў творы: характарыстыка герояў, паказ іх узаемаадносін, нараджэння першага кахання. Парадак падзей у творы (сюжэт), кампазіцыйныя часткі. Выразныя дыялогі ў апавяданні, мова герояў як сродак перадачы ўнутранага стану падлеткаў.

Мастацтва. Жывапіс: М. Казакевіч. «Юнацтва»; С. Гарачаў. «Дзяцінства»; Б. Кузняцоў. «Дзеці».

Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі (2 гадзіны)

Змітрок Бядуля. «Шчасце не ў золаце». Перадача паэтычнага зместу ў празаічнай форме. Прыкметы паэзіі – эмацыянальнасць, эпітэты, параўнанні, падобныя канструкцыі (сінтаксічны паралелізм), рытмізаваная мова, рыфмаваныя словы, падабенства паводле зместу да народнай песні. Прыкметы прозы ў творы – сюжэт, падзейнасць, свабодная мова. Галоўная думка: выяўленне ўласнага гонару простага чалавека перад спакусай багатага жыцця.

Уладзімір Корбан. «Малпін жарт». Перадача празаічнага зместу ў паэтычнай форме. Прыкметы паэзіі – вершаваная форма, рыфма. Прыкметы прозы – сюжэтнасць, падзейнасць, дыялогі, апавядальная інтанацыя. Галоўная думка: асуджэнне людзей, якія распальваюць звадкі ды сваркі і адчуваюць пры гэтым радасць.

Паказ жыцця ў публіцыстыцы і навуцы (6 гадзін)

Цётка. «Шануйце роднае слова». Час напісання артыкула і асаблівасці мовы. Галоўная думка артыкула (ідэя): «Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова». Заклапочанасць лёсам роднай культуры, патрыятычныя думкі ў тэксце. Прыёмы і сродкі ўздзеяння на пачуцці і думкі чытача ў публіцыстычным творы: аргументы, доказы і эмацыянальныя звароты да чытача, заклікі да актыўнай дзейнасці ў падтрымку роднай культуры. Адпаведнасць зместу артыкула рэаліям жыцця, адсутнасць мастацкай выдумкі.

Уладзімір Караткевіч. «Зямля пад белымі крыламі» (нарысы на выбар педагагічнага работніка). Цыкл мастацкіх нарысаў пра Беларусь, яе гісторыю, прыроду, культурныя традыцыі народа. Патрыятычная ідэя ў тэкстах. Апавядальны характар твора, разнастайнасць матэрыялу (дакументальныя звесткі, аповеды, рэцэпты, вынікі этнаграфічных, сацыялагічных даследаванняў, мастацкія ўстаўкі). Роля гумарыстычных, іранічных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да асобных жыццёвых з'яў. Публіцыстычнасць гучання, заклік любіць свой край.

Рэзерв вучэбнага часу (1 гадзіна)

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання: Якуб Колас. «Ручэй». Максім Багдановіч. «Маёвая песня» («Па-над белым пухам вішняў...»). Мікола Лупсякоў. Урывак з апавядання «Мэры Кэт» (пачынаючы са слоў «Я чую… Я чую, як шуміць вецер…» і да канца твора).

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага, навукова-папулярнага, публіцыстычнага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне;

выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх твораў розных жанраў (урыўкаў);

складанне планаў розных відаў (падрабязны і кароткі);

аналіз навукова-папулярнага, публіцыстычнага і літаратурнага твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей;

супастаўленне мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва; напісанне міні-сачыненняў паводле плана;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму (адказаў на праблемныя пытанні, кароткіх паведамленняў) з выкарыстаннем некалькіх крыніц; выкананне творчых заданняў па літаратуры.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць: аўтараў, назвы і змест праграмных твораў; тэарэтыка-літаратурныя паняцці (на ўзроўні азнаямлення) у аб'ёме, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

умець: выконваць аналіз мастацкага, навукова-папулярнага, публіцыстычнага твора (на элементарным узроўні); выказваць уласнае меркаванне пра вывучаныя творы і абгрунтоўваць яго; выконваць пісьмовыя работы (міні-сачыненне паводле плана); рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў (паведамленне, разгорнуты адказ на пытанне);

выконваць творчыя заданні па літаратуры; карыстацца рознымі тыпамі крыніц інфармацыі.

## IX КЛАС (70 гадзін)

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35 гадзін)

Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры (1 гадзіна)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра ролю беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры.

Паўтарэнне вывучанага ў VI–VIII класах (1 гадзіна)

Самастойныя і службовыя часціны мовы. Правапіс не, ні з рознымі часцінамі мовы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэксце самастойныя і службовыя часціны мовы, рабіць іх марфалагічны разбор, правільна ўжываць у маўленні.

Тэкст (1 гадзіна)

Тэкст і яго асноўныя прыметы (паглыбленае паўтарэнне).

Сінтаксічная сінаніміка.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць прыметы тэксту. Вызначаць прыметы тэксту, спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту.

Дзяліць тэксты на сказы і лагічныя часткі.

Сінтаксіс і пунктуацыя.

Словазлучэнне: будова, значэнне, ужыванне (4 гадзіны)

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Знаходзіць словазлучэнні ў тэксце; выяўляць галоўнае слова, ствараць і разгортваць словазлучэнні з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі; дакладна перадаваць змест прачытанага тэксту з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў, выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў.

Просты сказ. Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (8 гадзін)

Сказ як сінтаксічная адзінка, яго асноўная функцыя. Тыпы сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя сказы).

Простыя і складаныя сказы. Развітыя і неразвітыя сказы.

Парадак слоў у сказе. Лагічны націск (практычна).

Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, сэнсава-граматычныя адносіны паміж імі.

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць, іх граматычнае значэнне.

Спосабы выражэння даданых членаў сказа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць двухсастаўныя неразвітыя сказы ў тэкстах; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных неразвітых сказаў.

Дзяліць дэфармаваны тэкст на сказы і абазначаць іх межы; вызначаць сказы, якія выражаюць галоўную думку ў тэксце, і тыя, якія яго паясняюць; правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы.

Адрозніваць развітыя сказы ад неразвітых, вызначаць мэтазгоднасць ужывання іх у тэксце; знаходзіць галоўныя і даданыя члены сказа; ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных развітых сказаў.

Правільна далучаць выказнік да дзейніка. Складаць двухсастаўныя развітыя сказы на тэмы, звязаныя з працай людзей розных прафесій, аб’ядноўваць іх у тэксты з дапамогай паслядоўнай і паралельнай сувязі; вызначаць у тэкстах сродкі эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці.

Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (2 гадзіны)

Аднасастаўныя сказы. Віды аднасастаўных сказаў: пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя, назыўныя (азнаямленне).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы, адрозніваць іх па асноўных прыметах; ствараць вусныя разважанні з ужываннем аднасастаўных сказаў розных відаў; рабіць сінтаксічны разбор аднасастаўных сказаў.

Перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты з апісаннем з'яў прыроды.

Няпоўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (1 гадзіна)

Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе. Параўнальны аналіз маналагічных і дыялагічных тэкстаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах няпоўныя сказы, вызначаць іх будову; адрозніваць няпоўныя двухсастаўныя сказы ад поўных аднасастаўных; карыстацца няпоўнымі сказамі ў маналагічным і дыялагічным маўленні; рабіць сінтаксічны разбор няпоўных сказаў; афармляць няпоўныя сказы на пісьме ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

Ускладнены сказ (5 гадзін)

Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ужыванне.

Паняцце пра ўскладнены сказ. Сказы з аднароднымі членамі. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, знакі прыпынку.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць сказы з аднароднымі членамі, звязанымі спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі, у тым ліку сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, правільна афармляць іх на пісьме; выкарыстоўваць сказы з аднароднымі членамі пры стварэнні тэкстаў; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з аднароднымі членамі.

Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне (4 гадзіны)

Зваротак, выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, устаўныя канструкцыі; знакі прыпынку. Навучальны падрабязны пераказ тэксту.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, правільна інтанаваць іх, ужываць пры стварэнні вусных тэкстаў розных стыляў, афармляць на пісьме; рабіць сінтаксічны разбор сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі і выклічнікамі.

Пераказваць апавядальныя тэксты з элементамі разважання; пісаць лісты, у тым ліку афіцыйныя пісьмы.

Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне (6 гадзін)

Паняцце пра адасабленне. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку ў іх.

Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, знакі прыпынку. Сказы з адасобленымі акалічнасцямі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі, знакі прыпынку.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах сказы з адасобленымі членамі; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з адасобленымі членамі.

Карыстацца сказамі з адасобленымі членамі ў выказваннях, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку.

Ствараць вуснае сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры) паводле плана.

Сказы з параўнальнымі зваротамі (1 гадзіна)

Параўнальны зварот. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах сказы з параўнальным зваротам, правільна ставіць знакі прыпынку ў сказах з парўнальным зваротам.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год (1 гадзіна)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Тры роды літаратуры: эпічны, лірычны, драматычны.

Роды мастацкай літаратуры (5 гадзін)

Віктар Карамазаў. «Дзяльба кабанчыка» (скарочана). Праблематыка твора. Асуджэнне адчужэння дарослых дзяцей ад бацькоўскага дому. Клопат маці пра дзяцей і душэўная чэрствасць, няўвага да яе з боку дачок і зяця. Усведамленне сынам Сцяпанам віны перад бацькамі, шчымлівае пачуццё шкадавання да хворай маці. Сюжэт твора, майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы вясковага побыту. Характарыстыка герояў праз іх паводзіны і ўчынкі, мастацкія дэталі. Характэрныя прыметы эпічнага твора: аповед пра падзеі, што адбыліся ў мінулым; наяўнасць сюжэта і праз яго раскрыццё чалавечых характараў; аб’ектыўнасць адносін да герояў; паказ дэталяў.

Рыгор Барадулін. «Трэба дома бываць часцей». Праблематыка твора. Адносіны чалавека да роднага дому, мясцін, дзе праходзіла дзяцінства і юнацтва. Пачуцці і перажыванні, звязаныя з успамінамі пра родных і блізкіх, як выяўленне духоўнасці асобы. Выкарыстанне вобразных магчымасцей мовы, рытмічных сродкаў, строф пры афармленні думкі. Музычнае ўвасабленне верша ў песні І. Лучанка. Характэрныя прыметы лірычнага твора: пераважна паэтычныя творы, у якіх аўтар паказвае пачуцці і перажыванні героя.

Алесь Гарун. «Датрымаў характар». Час стварэння драматычнага абразка і лексіка таго часу. Канфлікт паміж настаўніцай і вучнямі – аснова твора. Раскрыццё характараў дзяцей праз іх рэплікі. Мэта аўтарскіх рэмарак – дакладнае тлумачэнне сітуацыі, пададзенай у дыялогу Зюка і Вінцуся. Гумар у драматычным творы. Характэрныя прыметы драматычнага твора: твор, прадстаўлены ў выглядзе рэплік персанажаў і аўтарскіх рэмарак і прызначаны для пастаноўкі на сцэне; дзеянне разгортваецца ў працэсе чытання твора або прагляду спектакля.

Мастацтва. Музыка: І. Лучанок. «Трэба дома бываць часцей» (словы Р. Барадуліна).

Лірычныя жанры (10 гадзін)

Грамадзянская лірыка.

Мікола Арочка. «Хлеб роднай мовы». Тэматыка грамадзянскай лірыкі: маці, мова, Айчына. Тэма верша М. Арочкі. Сардэчная прачуласць, эмацыянальная пранікнёнасць лірычнага твора. Прызнанне ў любові да роднай зямлі праз паэтызацыю вобраза хлеба – духоўнага скарбу і сімвала дабрабыту чалавека. Шматскладовыя словы, якія ўтвараюць рытмічны малюнак твора.

Максім Багдановіч. «Слуцкія ткачыхі». Тэма гістарычнага мінулага Айчыны. Выяўленне любові да радзімы і волі праз вобраз васілька – сімвал Бацькаўшчыны. Лёс ткачых. Спалучэнне патрыятычнага пафасу з задушэўнасцю выказвання. Двухчастковая

кампазіцыя верша. Музычнае ўвасабленне лірычнага твора ў выкананні ансамбля «Пеняры».

Філасофская лірыка.

Максім Танк. «Шчасце». Тэматыка філасофскай лірыкі: сэнс чалавечага жыцця, быццё чалавека. Тэма шчасця ў вершы. Роздум паэта пра прызначэнне чалавека на зямлі. Радзіма, мова, сяброўства – аснова чалавечага шчасця. Рыфма ў вершы. Будова верша: аднастайнасць сінтаксічных канструкцый (сінтаксічны паралелізм) і павышэнне, узмацненне інтанацыі.

Анатоль Вярцінскі. «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…». Тэма прызначэння чалавека на зямлі. Злітнасць лёсу чалавека з лёсам свету, усведамленне адказнасці за жыццё на зямлі. Сцвярджэнне актыўнай жыццёвай пазіцыі чалавека-грамадзяніна, чалавека-творцы. Форма маналогу ў раскрыцці ідэі твора. Рады аднародных членаў сказа. Паўторы ў творы (рэфрэн), рыфмы да рэфрэна тварыць у тэксце.

Інтымная лірыка.

Максім Багдановіч. «Раманс» («Зорка Венера»). Тэматыка інтымнай лірыкі: каханне, глыбокія ўнутраныя перажыванні чалавека. Тэма кахання ў рамансе. Вобраз зоркі як сімвала кахання. Душэўны стан лірычнага героя: светлы сум, лёгкі дакор лёсу за немінучае расстанне з каханай. Паўторы, якія арганізуюць кампазіцыю верша, запаволены тэмп паэтычнага выказвання (праз трохскладовыя стопы). Музычнасць лірычнага твора, яе ўвасабленне ў песні ансамбля «Песняры».

Аркадзь Куляшоў. «Бывай». Тэма кахання ў элегіі. Пяшчотнае і шчымлівае развітанне з юнацкім каханнем. Глыбокі лірызм у выяўленні пачуццяў і перажыванняў – болю, горычы, смутку ад вымушанага расстання з каханай. Эпітэты ў творы, словы з пераносным значэннем (метафары). Песеннасць і меладычнасць верша, што ўвасоблены ў выкананні твора ансамблем «Песняры».

Пейзажная лірыка.

Якуб Колас. «О, край родны, край прыгожы!..» (урывак з паэмы «Сымон-музыка»). Тэматыка пейзажнай лірыкі: прырода, краявіды. Паэтызацыя прыгажосці роднай старонкі, захапленне непаўторнасцю беларускіх пейзажаў у паэме. Адчуванне лірычным героем сваёй духоўнай сувязі з зямлёй продкаў. Пахі, гукі і краявіды роднай зямлі. Перадача інтанацыйнага малюнка праз сінтаксічную будову. Энергічны тэмп верша (праз двухскладовыя стопы).

Максім Багдановіч. «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…». Паэтычная адухоўленасць з’яў прыроды, захапленне гармоніяй і прыгажосцю ціхай зорнай ночы. Сцвярджэнне непарыўнай еднасці чалавека з прыродай. Стан лірычнага героя, яго настрой, перададзены ў вершы. Маляўнічасць вобразаў. Асаблівасці рыфмавання радкоў.

Класічныя формы лірычных твораў.

Максім Багдановіч. «Санет» («Замёрзла ноччу шпаркая крыніца…»). Выяўленне неадольнасці стваральных сіл жыцця, увасобленых у вобразе гаючай крыніцы. Перанос гэтага сімвала на розныя станы чалавека. Форма санета, выяўленая ў творы. Кальцавая рыфма ў чатырохскладовых строфах (катрэнах). Сродкі перадачы эмоцый.

Данута Бічэль. «Лёгкія сняжынкі ў цішы…». Паэтызацыя чысціні і прыгажосці снегападу. Светлы, празрысты настрой верша. Адчуванне цішыні і спакою, душэўнай лагоднасці. Раскрыццё асноўнай думкі трыялета праз паўторы радкоў.

Мастацтва. Музыка: У. Мулявін. «Слуцкія ткачыхі» (словы М. Багдановіча); С. Рак-Міхайлоўскі. «Зорка Венера» (словы М. Багдановіча); І. Лучанок. «Алеся» (словы А. Куляшова); «Песняры. Залаты дыск»; «Песняры. Лепшыя песні» (частка 1) і іншыя. Жывапіс: «Мая зямля» (альбом (укладальнік В. Трыгубовіч); «Беларускі савецкі жывапіс» (альбом (укладальнік А. Аладава) і іншыя. Фотамастацтва: «Пакланіся прыродзе» (альбом); В. Алешка. «Спатканне з лесам»: альбом; С. Плыткевіч. «Мая Беларусь» (альбом); Г. Ліхтаровіч. «Добры дзень, Беларусь» (альбом).

Эпічныя жанры (8 гадзін)

Якуб Колас. «Хмарка». Ідэя адказнасці кожнага чалавека перад сваёй Бацькаўшчынай за яе дабрабыт і росквіт як галоўная ўмова асабістага шчасця. Сувязь апавядання з вуснай народнай творчасцю, з формай казкі. Іншасказальны змест твора, ачалавечаныя вобразы Хмаркі, Скалы, Арла, Дуба, Бусла. Сюжэт твора. Роля пейзажу ў раскрыцці ідэі твора.

Генрых Далідовіч. «Губаты» (урывак да слоў «У нас табе не жыццё... І нам клопату з табою...»). Ідэя дабрыні і міласэрнасці ў адносінах да прыроды. Вобразы герояў твора – лесніка і яго дзяцей, рысы іх характару, учынкі. Майстэрства пісьменніка ў перадачы шматфарбнасці навакольнага свету праз апісанне пушчы і яе жыхароў, паказ вобраза ласяняці. Лірычнасць апавядання. Развіццё сюжэта.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектакль «Вераб’іная ноч» (дзяржаўная ўстанова «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь» драматычны тэатр Беларускай Арміі», рэжысёр М. Дударава).

Ліра-эпічныя жанры (6 гадзін)

Янка Купала. «Магіла льва» (скарочана). Ліра-эпічная паэма – спалучэнне эпасу і лірыкі. Зварот да гістарычнага мінулага, асэнсаванне народнай легенды. Рамантызаваныя вобразы Наталькі і Машэкі. Падзейны ланцужок паэмы. Лірычныя адступленні.

Аркадзь Куляшоў. «Маці». Адлюстраванне трагізму падзей Вялікай Айчыннай вайны ў баладзе. Фальклорныя вытокі сюжэта, сродкаў раскрыцця вобраза маці. Выкарыстанне народна-паэтычнай вобразнасці. Пачуцці, якія перадае аўтар, эмоцыі, якія выклікае твор.

Кандрат Крапіва. «Ганарысты Парсюк». Вершаваная форма і эпічны змест у байцы. Крытыка чалавечых заган і недахопаў: ганарыстасці, фанабэрлівасці, агрэсіўнасці. Прыёмы стварэння камічных сітуацый (сітуацыі, устойлівыя выразы, запазычаныя словы). Народная мудрасць, гумар у байках. Блізкасць мовы твора да гутарковай. Мараль як выяўленне аўтарскай пазіцыі.

Мастацтва. Жывапіс: ілюстрацыі беларускіх мастакоў да паэмы Янкі Купалы «Магіла льва». Музыка: І. Лучанок. «Балада аб маці» (словы А.Куляшова). Скульптура: манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі А. Ф. Купрыянавай (скульптары А. Заспіцкі, І. Місько, М. Рыжанкоў, архітэктар А. Трафімчук).

Драматычныя жанры (4 гадзіны)

Аляксей Дудараў. «Вечар» (урывак, дзея першая да слоў «З’яўляецца Ганна. З сумкай хлеба, стомленая і вясёлая» або на выбар педагагічнага работніка.

Праблематыка твора. Лёсы састарэлых адзінокіх жыхароў сучаснай вёскі. Чалавечая драма забытых дзецьмі старых, іх жыццёвыя праблемы і клопаты. Сутыкненне жыццёвых філасофій Мульціка і Гастрыта: Мульцік – добразычлівы да людзей, сумленны, жартаўлівы, працавіты; Гастрыт – нікчэмны, пануры, азлоблены на ўсіх чалавек. Асаблівасці драматычнага твора.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: «Вечар» – тэле-, радыё-, тэатральныя спектаклі (у пасанове дзяржаўнай ўстановы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы» і іншых тэатраў краіны).

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання Рыгор Барадулін. «Трэба дома бываць часцей». Максім Танк. «Шчасце». Максім Багдановіч. «Раманс» («Зорка Венера»).

АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне; выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх твораў розных жанраў;

складанне планаў розных відаў (падрабязны, цытатны, іншыя); аналіз літаратурнага твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей;

супастаўленне мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва; напісанне сачыненняў паводле плана;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму з выкарыстаннем некалькіх крыніц;

выкананне творчых заданняў па літаратуры.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць: аўтараў, назвы і змест праграмных твораў; тэарэтыка-літаратурныя паняцці (на ўзроўні азнаямлення) у аб'ёме, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

умець: выконваць аналіз мастацкага твора (на элементарным узроўні);

выказваць уласнае меркаванне пра вывучаныя творы і абгрунтоўваць яго;

выконваць пісьмовыя работы (сачыненне паводле плана); рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў; выконваць творчыя заданні па літаратуры; карыстацца рознымі тыпамі крыніц інфармацыі.

X КЛАС (70 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35 гадзін)

Беларуская мова ў сям'і славянскіх моў і моў народаў свету (1гадзіна).

Паглыбленне паняцця аб асаблівасцях беларускай мовы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра спецыфічныя асаблівасці беларускай мовы.

Тэкст (2 гадзіны)

Тэкст і яго асноўныя прыметы: тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць (паглыбленае паўтарэнне).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць прыметы тэксту. Вызначаць прыметы тэксту, спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту. Падбіраць сінтаксічныя сінонімы да розных сінтаксіных адзінак. Ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Паўтарэнне вывучанага ў VI–IX класах (2 гадзіны)

Слова, словазлучэнне, сказ як асноўныя моўныя адзінкі. Тыпы простых сказаў па мэце выказвання, інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя) і будове (двухсастаўныя, аднасастаўныя, няпоўныя, ускладненыя).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ствараць выказванні з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў, пашыраць тэксты; рабіць сінтаксічны разбор простых сказаў. Вызначаць тып тэкстаў, выяўляць у іх апорныя словы і словазлучэнні, сродкі сувязі сказаў і лагічных частак; ствараць выказванні з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў, пашыраць тэксты.

Стылі маўлення (1 гадзіна)

Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення (паглыбленае паўтарэнне).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне (1 гадзіна)

Паняцце пра складаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаных сказах. Тыпы складаных сказаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах складаныя сказы розных тыпаў; вызначаць тэксты-разважанні публіцыстычнага стылю, выяўляць іх адрасата і мэтанакіраванасць, дзяліць на лагічныя часткі; ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў; ствараць складаныя сказы розных тыпаў. Выконваць падрабязны пераказ тэксту.

Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (4 гадзіны)

Паняцце пра складаназлучаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах.

Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць складаназлучаныя сказы ў тэкстах, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; будаваць складаназлучаныя сказы, выкарыстоўваць іх у самастойных выказваннях, правільна ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць простыя сказы з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаныя – у простыя; рабіць сінтаксічны разбор складаназлучаных сказаў.

Перакладаць тэксты з рускай мовы на беларускую.

Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (10 гадзін)

Паняцце пра складаназалежны сказ.

Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснымі часткамі месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальнымі, параўнальнымі, спосабу дзеяння, меры і ступені (сродкі сувязі, знакі прыпынку).

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах складаназалежныя сказы з рознымі відамі даданай часткі; складаць складаназалежныя сказы, выкарыстоўваць іх у маўленні, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць простыя сказы з адасобленымі даданымі членамі ў складаназалежныя; рабіць сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (5 гадзін)

Паняцце пра бяззлучнікавы складаны сказ. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах, вызначаць сінтаксічныя адносіны паміж часткамі, інтанаваць сказы ў адпаведнасці з сэнсам, ставіць знакі прыпынку; ужываць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні; рабіць сінтаксічны разбор бяззлучнікавага складанага сказа.

Пераказваць тэкст, дакладна перадаючы яго змест, будову і моўнае афармленне.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне (3 гадзіны)

Паняцце пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах складаныя сказы з некалькімі відамі сувязі частак, абгрунтоўваць мэтазгоднасць іх ужывання, складаць новыя сказы, карыстацца імі ў маўленні, ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць сказы з рознымі відамі сувязі частак у сказы іншай граматычнай структуры; рабіць сінтаксічны разбор сказа з рознымі відамі сувязі частак. Пісаць заяву, аўтабіяграфію.

Сінтаксічныя канструкцыіз чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне (3 гадзіны)

Спосабы перадачы чужой мовы.

Асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай мовай. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

Маналог. Дыялог, яго афармленне на пісьме.

Сказы з ускоснай мовай.

Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме. Эпіграф.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах канструкцыі з простай і ўскоснай мовай, інтанаваць іх, вызначаць асаблівасці будовы, выкарыстоўваць у маўленні, ставіць знакі прыпынку; замяняць простую мову ўскоснай і наадварот.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год (2 гадзіны)

Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго асноўныя адзінкі і іх характарыстыка.

Узаемасувязь сінтаксісу, лексікі і марфалогіі.

Нормы літаратурнага вымаўлення. Паўтарэнне складаных пытанняў арфаграфіі і пунктуацыі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Выяўляць у тэкстах складаныя сказы розных тыпаў; ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў; ствараць складаныя сказы розных тыпаў.

Захоўваць арфаэпічныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Рэзерв вучэбнага часу (1 гадзіна)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Літаратура – мастацтва слова. Функцыі літаратуры ў грамадстве.

Постаці айчыннай гісторыі ў беларускай літаратуры (3 гадзіны)

«Жыціе Ефрасінні Полацкай» (скарочана). Жанр жыція, яго адрозненне ад біяграфіі. Ідэалізацыя героя жыція, апяванне яго хрысціянскіх дабрачыннасцяў. Адлюстраванне ў творы жыцця і дзейнасці асветніцы. Рэаліі даўніх часоў у творы. Апошняя частка твора – пахвала Ефрасінні: эмацыянальнасць, узнёсласць, паэтычнасць.

Францыск Скарына. Прадмова да кнігі «Юдзіф» (урывак у перакладзе на сучасную беларускую мову). Прадмова як жанр даўняй кніжнасці. Час стварэння Скарынам прадмовы да кнігі. Агульначалавечы змест твора. Сцвярджэнне ідэі патрыятызму, грамадзянскага абавязку. Разгорнутае параўнанне ў творы.

Мікола Гусоўскі. Паэма «Песня пра зубра» (урывак са слоў «Толькі ж усё гэта мела карэнь у княжэнне…» да «Прад Ліцвіном пахіляліся моўчкі з пакорай»). Гісторыя

стварэння паэмы. Вобраз князя Вітаўта, высокая аўтарская ацэнка дзейнасці князя. Здабыткі князя Вітаўта ў паэме. Асаблівасці вершаскладання ў даўняй літаратуры: апора не на рыфму, а на роўную колькасць складоў у радку.

Мастацтва. Скульптура: А. Дранец. «Францыск Скарына»; У. Панцялееў. Помнік М. Гусоўскаму ў Мінску. Жывапіс: Я. Драздовіч. «Францыск Скарына», «Друкарня Францыска Скарыны ў Вільні»; В. Барабанцаў. «Мікола Гусоўскі»; М. Басалыга. «Мікола Гусоўскі»; А. Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да паэмы «Песня пра зубра»; Я. Кулік. Ілюстрацыі да паэмы «Песня пра зубра». Музыка: Д. Смольскі. Опера «Францыск Скарына». Кінамастацтва: «Песня пра зубра» (рэжысёр Э. Перагуд).

Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў мастацкай літаратуры (6 гадзін)

Ян Баршчэўскі. «Шляхціц Завальня» (са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»). «Шляхціц Завальня» – зборнік фантастычных апавяданняў. Выяўленне характару беларуса ў апавяданні. Хараство духоўнага свету чалавека, які трымаецца векавых традыцый, звычаяў. Вобраз Завальні ў творы. «Плачка». Жаночы прывід – галоўны вобраз апавядання. Рамантычны сюжэт пошукаў даўніх скарбаў. Рэальнае і нерэальнае ў тэксце. Павучальны змест твора.

Адам Міцкевіч. Балада «Свіцязянка». А. Міцкевіч і Беларусь. Фальклорная аснова твора. Сюжэт балады. Рэальнае і міфічнае ў тэксце. Павышаная эмацыянальнасць у творы, рамантычнае вырашэнне тэмы кахання.

Канстанцін Вераніцын. Паэма «Тарас на Парнасе» (скарочана). Час напісання паэмы. Рэальныя асобы і антычныя багі ў творы. «Пераапрананне» аўтарам багоў у звычайных сялян. Тарас як тыповы народны герой, рысы яго характару: кемлівасць, абачлівасць, дасціпнасць.

Сатыра і гумар у тэксце.

Францішак Багушэвіч. Прадмова да зборніка «Дудка беларуская» (скарочана). Ідэя прадмовы да зборніка «Дудка беларуская». Пошукі асноў духоўнага і гістарычнага адраджэння народа. Прыкметы публіцыстыкі ў творы (зварот да чытача, уздзеянне з дапамогай эмоцый і аргументаў). Сучаснасць ідэй, закладзеных у прадмове.

Мастацтва. Скульптура: Л. Гумілеўскі, С. Гумілеўскі. Помнік В. Дуніну-Марцінкевічу і С. Манюшку ў Мінску; М. Якавенка. Помнік В. Дуніну-Марцінкевічу ў Тупальшчыне (Валожынскі раён); В. Янушкевіч. «В. Дунін-Марцінкевіч» (гіпс); літаратурна-мастацкая кампазіцыя «Канстанцін Вераніцын і яго паэма «Тарас на Парнасе»«ў Гарадку (Віцебская вобласць); А. Заспіцкі, А. Фінскі. Помнік Адаму Міцкевічу ў Мінску; Л. Гумілеўскі, С. Гумілеўскі. Помнік Ф. Багушэвічу ў Смаргоні. Жывапіс: В. Ваньковіч. «Партрэт Адама Міцкевіча», «Міцкевіч на скале Аю-Даг»; С. Герус. «Адам Міцкевіч»; У. Пракапцоў. «А. Міцкевіч. Боль паэта»; К. Альхімовіч. «Свіцязянка»; У. Пасюкевіч. «Свіцязянская балада. Паэт А. Міцкевіч»; малюнкі Н. Орды «Сядзіба Міцкевічаў у Завоссі», «Туганавічы»; Я. Ціхановіч; У. Тоўсцік. «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – драматург»; І. Рэй. «В. Дунін-Марцінкевіч з дочкамі Камілай і Цэзарынай»; Я. Ціхановіч. «Партрэт Вінцука Дуніна-Марцінкевіча»; «Канстанцін Вераніцын» (малюнак С. Харэўскага); ілюстрацыі да паэмы «Тарас на Парнасе» (мастакі У. Гладкевіч, Н. Гуціеў, В. Славук); «Партрэт Францішка Багушэвіча». Музыка: У. Кандрусевіч. Мюзікл «Залёты» (паводле В. Дуніна-Марцінкевіча). Тэатральнае мастацтва: спектакль «Тарас на Парнасе» (установа «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача», рэжысёр Н. Башава); спектакль «Пінская шляхта» (дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы», рэжысёр М. Пінігін).

Нацыянальнае і агульначалавечае ў мастацтве слова (12 гадзін)

Янка Купала. Грамадзянская лірыка паэта. «Мая малітва» («Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...»). Чалавек, яго душа і радзіма ў творах Купалы. Жанр малітвы, сіла яго

ўздзеяння. Патрыятычны пафас твора. «Роднае слова» («Магутнае слова, ты, роднае слова»). Выяўленне глыбокага пачуцця да беларускай мовы, разумення яе цярністага шляху. Гарманічнасць кампазіцыі твора, дасканалась зліцця формы і зместу. Роля эпітэтаў у выяўленні ідэі верша. Інтымная лірыка: «Явар і каліна». Фальклорныя матывы ў паказе кахання. Вобразы хлопца і дзяўчыны, увасобленыя ў вершы. Паэтызацыя пачуцця. Эпітэты ў творы. Кальцавая будова верша. «Бандароўна». Паэма як буйны паэтычны жанр. Фальклорная першакрыніца паэмы. Рамантычная аснова твора. Сутнасць канфлікту ў паэме. Вобразы-антыподы. Драматызм дзеяння. Маральная перавага Бандароўны над панам. Агульначалавечыя каштоўнасці (жыццё, свабода, незалежнасць) у творы.

Якуб Колас. Грамадзянская лірыка паэта: «Не бядуй!». Вера паэта ў шчаслівую долю для роднага краю. Патрыятычны пафас твора. Роля паўтораў у арганізацыі верша. Пейзажная лірыка: «Родныя вобразы», «Першы гром». Паэтызацыя роднай прыроды, выяўленне сувязі стану чалавечай душы са станам наваколля. Майстэрства кампазіцыі, мастацкага эпітэта. «Новая зямля» (асобныя раздзелы). «Новая зямля» – мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця. Аўтабіяграфічнасць паэмы. Народны побыт і прырода ў паэме. Вобразы ў паэме: мудрасць і душэўная прыгажосць Антося, Ганны; вобразы дзяцей. Трагедыя лёсу Міхала. Лірычнае і эпічнае ў паэме Якуба Коласа. Асаблівасці мовы пачатку XX стагоддзя. Нацыянальныя каштоўнасці (зямля, воля) у творы.

Максім Багдановіч. Грамадзянская лірыка паэта: «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»). Паэтычнае ўвасабленне сілы народнага духу, гістарычнай памяці. Асаблівасць санета: узмацненне ўздзеяння на чытача ад чатырохрадковых к трохрадковым строфам. Філасофская лірыка: «Жывеш не вечна, чалавек...». Роздум паэта над сэнсам жыцця, палымяны заклік да духоўнай дасканаласці, актыўнай жыццёвай пазіцыі. Кампазіцыйная адметнасць твора. Пейзажная лірыка: «Плакала лета, зямлю пакідаючы...». Майстэрства перадачы элегічнага настрою ў творы. Інтымная лірыка: «Маладыя гады». Паказ пачуцця праз мастацкія азначэнні. Гармонія, прастата і лёгкасць гучання верша. Агульначалавечае гучанне паэзіі Максіма Багдановіча.

Мастацтва. Скульптура: З. Азгур. Помнік Янку Купалу ў Вязынцы (Мінская вобласць); А. Анікейчык. Помнік Янку Купалу ў Нью-Ёрку (Араў-парк); помнік Янку Купалу ў Мінску (скульптары А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Заспіцкі, архітэктары Ю. Градаў, Л. Левін); З. Азгур. Помнік Якубу Коласу (архітэктары Ю. Градаў, Л. Левін); мастацкамемарыяльны комплекс «Шлях Коласа»; С. Вакар. Помнік М. Багдановічу. Жывапіс: В. Шаранговіч. «А хто там ідзе?»; П. Сергіевіч. «А хто там ідзе?»; М. Савіцкі. «Янка Купала»; А. Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да паэмы «Бандароўна»; М. Басалыга. Ілюстрацыі да паэмы «Бандароўна»; У. Стальмашонак. «Партрэт Якуба Коласа»; А. Волкаў. «Настаўніцкі з’езд 1906 года»; В. Шаранговіч. Ілюстрацыі да паэмы «Новая зямля»; С. Герус. «Якуб Колас. Новая зямля»; У. Сулкоўскі. Серыя палотнаў «Радзіма Якуба Коласа»; Г. Вашчанка. «М. Багдановіч»; В. Волкаў. «М. Багдановіч»; У.Новак. «М. Багдановіч у Ялце»; У. Пасюкевіч. «У краіне светлай...» (М. Багдановіч)»; В. Шматаў. «Партрэт Максіма Багдановіча». Музыка: Ю. Семяняка. «Явар і каліна»; песні і рамансы на словы паэта (кампазітары У. Алоўнікаў, А. Багатыроў, В. Войцік, Д. Камінскі, С. Картэс, В. Кузняцоў, М. Літвін, І. Лучанок, А. Мдывані, Л. Мурашка, Д. Смольскі, У. Солтан, А. Чыркун); У. Алоўнікаў. «Дуб», «Глуха шэпча лес», «Мой родны кут»; Л. Захлеўны. «На новай зямлі»; Ю. Семяняка. «Добра ў лузе ў час палудні»; Ю. Семяняка. Опера «Новая зямля» (лібрэта А. Петрашкевіча); Г. Гарэлава. Вакальны цыкл «Дзявочыя песні»; І. Лучанок. «Вераніка»; Ю. Семяняка. Опера «Зорка Венера»; Я. Тарасевіч. «Асенняя песня (Плакала лета)»; Л. Шлег. Вакальны цыкл «Вянок»; песні і рамансы на словы паэта (кампазітары А. Абіліёвіч, М. Аладаў, А. Багатыроў, У. Мулявін, І. Палівода, А. Туранкоў, Э. Тырманд).

Тэатральнае мастацтва: спектакль «Міхалава зямля» (установа «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача», рэжысёр У. Савіцкі).

Чалавек у часе і прасторы ў творах беларускай літаратуры (12 гадзін)

Кузьма Чорны. «На пыльнай дарозе». Час, паказаны ў апавяданні. Тэма і ідэя апавядання. Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці ўнутранага свету герояў. Гуманістычны і жыццесцвярджальны пафас апавядання. Пазіцыя аўтара ў адносінах да маленькага героя.

Аркадзь Куляшоў. Вершы «Мая Бесядзь», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «На паўмільярдным кіламетры», «Нябёсы – акіян, я знаў даўно...» (2-3 на выбар педагагічнага работніка). Раскрыццё агульначалавечага ў разуменні жыцця праз глыбока асабістыя перажыванні. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей, бязмежнасці пазнання сябе і свету. Прастата слова і складанасць думкі ў творах паэта. Задумлівасць, разважлівасць гучання яго твораў.

Максім Танк. Вершы «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...», «Не знаю...» (2-3 на выбар педагагічнага работніка). Тэмы і вобразы паэзіі Максіма Танка. Увага да ўнутранага свету чалавека, сцвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцей. Жанр верлібра ў творчасці Максіма Танка. Песеннае ўвасабленне твора «Завушніцы» ансамблем «Песняры».

Уладзімір Караткевіч. «Лебядзіны скіт». Легенда пра паходжанне назвы «Белая Русь» у казцы. Сутыкненне дабра і зла ў аснове сюжэтнага дзеяння. Увасабленне ў вобразе старца лепшых чалавечых якасцей – адданасці свайму народу, гатоўнасці прыняць смерць дзеля яго выратавання. Маральная перамога старца над Батыем. Роля вобраза філосафа Юсуфі ў раскрыцці ідэі твора.

Яўгенія Янішчыц. Вершы «Ты пакліч мяне. Пазаві...», «Чаму ніколі не баюся я...», «Не воблака, а проста аблачынка...», «Любоў мая...» (2-3 на выбар педагагічнага работніка). Тэматычная палітра паэзіі Яўгеніі Янішчыц: малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, каханне. Асаблівасці паэтычнага стылю: пяшчотнасць, мяккасць выяўлення аўтарскага пачуцця.

Мастацтва. Скульптура: З. Азгур. «Пісьменнік Кузьма Чорны»; І. Міско, А. Фінскі. Помнік Максіму Танку ў Мядзелі; І. Голубеў. Помнік У. Караткевічу ў Оршы (Віцебская вобласць). Жывапіс: І. Ахрэмчык. «Партрэт К. Чорнага»; Х. Ліўшыц. «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Пячышчах у 1942 годзе»; У. Кожух. «Новая дарога»; М. Рагалевіч. «Беларуская калыханка»; А. Бараноўскі. «Пара залатых бяроз»; Г. Вашчанка. «Крылы»; Я. Драздовіч. «Космас», «Артаполіс», «Трывеж», «Панарама месячнага горада», «Падкружніковы краявід на планеце Сатурн»; Г. Гарэлаў. «Партрэт Максіма Танка»; С. Вярсоцкі. «Возера Нарач»; С. Герус. «Партрэт М. Танка»; Я. Зайцаў. «Партрэт М. Танка»; Н. Шчасная. «Партрэт М. Танка»; В. Масцераў. «Яўгенія Янішчыц»; А. Лось. «Паэтэса Яўгенія Янішчыц»; Г. Вашчанка. «Маё Палессе». Музыка: Э. Наско. Вакальная музыка «Рамансы на вершы А. Куляшова»; У. Мулявін. Раманс «Завушніцы»; Д. Смольскі. Раманс «Быць чалавекам я рад»; Ю. Талеснік. Раманс «Завушніцы»; Э. Тырманд. Рамансы «Мой хлеб надзённы», «Сасна», «Ва ўсім, вядома, вінават».

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання:

Янка Купала. «Явар і каліна».

Якуб Колас. «Леснікова пасада» (з паэмы «Новая зямля») – урывак (са слоў «Мой родны кут, як ты мне мілы!..», заканчваючы словамі «Ка мне, вясна ты маладая!..»).

Максім Танк. «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...».

Яўгенія Янішчыц. «Ты пакліч мяне. Пазаві...».

АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне;

выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх твораў розных жанраў;

аналіз літаратурнага твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з твораміiншых відаў мастацтва; напісанне сачынення паапорнай схеме;

падрыхтоўка вуснага водгука на мастацкі твор;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму (адказаў на праблемныя пытанні, паведамленняў, прэзентацый) з выкарыстаннем некалькіх крыніц; выкананне творчых заданняў па літаратуры.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць асноўныя перыяды развіцця нацыянальнай літаратуры; аўтараў, назвы і змест праграмных твораў;звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, неабходныя для разумення канкрэтнага твора; тэарэтыка-літаратурныя паняцці на ўзроўні, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

умець выконваць цэласны аналіз мастацкага твораўадзінстве ідэйнага зместу і мастацкай формы; самастойна ацэньваць вывучаныя творы з улікам іх мастацкіх асаблівасцяў і абгрунтоўваць гэту ацэнку; выконваць пісьмовыя работы (сачыненне па апорнай схеме); рыхтваць вусны водгук на літаратурны твор; рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў; выконваць творчыя заданні па літаратуры.

XI КЛАС (70 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35 гадзін)

Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства (1 гадзіна)

Мова як грамадская з’ява. Функцыі мовы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Асэнсоўваць мову як грамадскую з’яву. Усведамляць функцыі мовы і ролю мовы ў жыцці чалавека і грамадства.

Маўленне (1 гадзіна)

Маўленне як працэс маўленчых зносін. Віды маўленчай дзейнасці. Формы маўленчай камунікацыі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Даваць характарыстыку маўленчай сітуацыі; размяжоўваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне.

Адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне; весці дыялог у сітуацыі афіцыйных і неафіцыйных маўленчых зносін; валодаць навыкамі слухання, чытання, гаварэння і пісьма.

Тэкст (2 гадзіны)

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту.

Апісанне, апавяданне, разважанне як функцыянальныя тыпы маўлення.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць асноўныя прыметы тэксту.

Вызначаць адрасата і мэтанакіраванасць тэксту; выяўляць прыметы тэксту, вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, даваць загаловак, дзяліць тэкст на часткі (падтэмы і мікратэмы) і абзацы; вызначаць віды і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце, выдзяляць апорныя (ключавыя) словы, словазлучэнні, сказы.

Аналізаваць і ствараць тэксты розных тыпаў маўлення, складаць іх кампазіцыйныя схемы.

Культура маўлення (1 гадзіна)

Асноўныя якасці культуры маўлення. Правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення), нормы і правілы маўленчых паводзін.

Ужываць згодна з маўленчай сітуацыяй і зместам камунікацыі моўныя сродкі для наладжвання неканфліктных, добразычлівых і паспяховых узаемаадносін; захоўваць і ўдасканальваць культуру маўленчых паводзін.

Дарэчы карыстацца нацыянальным маўленчым этыкетам.

Рыхтаваць вуснае выступленне (віншавальнае прывітанне, заклік да выканання пэўнага дзеяння, запрашэнне да ўдзелу ў карыснай грамадскай справе і іншае) з захаваннем норм маўленчага этыкету.

Арфаэпічныя нормы (2 гадзіны)

Вымаўленне галосных і зычных гукаў. Вымаўленне некаторых спалучэнняў зычных.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць парушэнні арфаэпічных норм беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць арфаэпічныя нормы; карыстацца арфаэпічнымі слоўнікамі.

Акцэнталагічныя нормы (1 гадзіна)

Націск і яго функцыі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць акцэнталагічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць парушэнні акцэнталагічных норм беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць акцэнталагічныя нормы; карыстацца слоўнікамі для вызначэння правільнай пастаноўкі націску ў словах.

Арфаграфічныя нормы (11 гадзін)

Правапіс галосных о, э, а; е, ё, я; спалучэнняў галосных у запазычаных словах, прыстаўных галосных. Правапіс зычных (звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых, прыстаўных і ўстаўных зычных, літар у і ў, д і дз, т і ц, падоўжаных зычных, некаторых спалучэнняў зычных). Правапіс мяккага знака і апострафа. Правапіс вялікай і малой літар. Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны; і, ы, й пасля прыставак.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць парушэнні арфаграфічных норм беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць арфаграфічныя нормы; карыстацца арфаграфічнымі слоўнікамі.

Лексічныя нормы (2 гадзіны)

Ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем, адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў. Правілы выкарыстання сінонімаў, антонімаў, паронімаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць лексічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Знаходзіць і выпраўляць лексічныя недахопы ў чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць лексічныя нормы ў маўленні; карыстацца тлумачальнымі слоўнікамі.

Фразеалагічныя нормы (1 гадзіна) Правілы ўжывання фразеалагізмаў у маўленні.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць фразеалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць памылкі ва ўжыванні фразеалагічных адзінак у чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць фразеалагічныя нормы ў маўленні; карыстацца фразеалагічнымі і тлумачальнымі слоўнікамі.

Словаўтваральныя нормы (2 гадзіны)

Утварэнне слоў у адпаведнасці са словаўтваральнымі нормамі. Асаблівасці ўжывання вытворных слоў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць словаўтваральныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць памылкі ва ўтварэнні слоў у чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць словаўтваральныя нормы ў маўленні; карыстацца словаўтваральнымі і марфемнымі слоўнікамі.

Марфалагічныя нормы (10 гадзін)

Ужыванне назоўнікаў, лік, род якіх не супадае ў беларускай і рускай мовах; назоўнікаў, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку; назоўнікаў агульнага роду, нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур.

Ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў, прыналежных прыметнікаў.

Ужыванне форм ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.

Ужыванне колькасных і парадкавых лічэбнікаў; спалучальнасць зборных лічэбнікаў з назоўнікамі і займеннікамі.

Ужыванне асабовых займеннікаў, зваротнага займенніка сябе, ужыванне прыназоўніка пры адмоўным займенніку; акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў сам, сама, самы, ніхто, нішто.

Ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў, адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу; акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных формаў дзеясловаў.

Ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў.

Ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць марфалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць парушэнні марфалагічных нормаў беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць марфалагічныя нормы; карыстацца слоўнікамі і даведнікамі для ўстанаўлення правільнага напісання слоў розных часцін мовы.

Паўтарэнне і сістэматызацыя вывучанага (1 гадзіна)

Моўныя нормы і культура маўлення.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры.

Даўняя літаратура (XI–XVIII стст.) (3 гадзіны)

Літаратура эпохі Сярэдневякоўя.

Кірыл Тураўскі. Кароткія звесткі пра жыццё і дзейнасць Кірыла Тураўскага. Жанр слова ў даўняй літаратуры. «Слова святога Кірыла аб кніжным чытанні і навуцы». Пропаведзь маральнага ўдасканалення чалавека праз навукі. Красамоўства асветніка.

Літаратура эпохі Адраджэння

Францыск Скарына. Кароткія звесткі пра жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны. Імкненне Ф. Скарыны наблізіць кнігу да народа (старабеларуская мова, прадмовы, тлумачэнні). «Прадмова да ўсёй Бібліі»: змест і ідэя твора.

Літаратура эпохі Барока і Асветніцтва

Сімяон Полацкі. Кароткія звесткі пра жыццё і дзейнасць. Вершатворчасць на беларускай мове. Каліграмы Сімяона Полацкага. Дыдактычны верш «Папярэджвай напачатку»: жывая мова, трапныя параўнанні, гумар.

Мастацтва. Скульптура: помнік Кірылу Тураўскаму ў Тураве (скульптар М. Інькоў, архітэктар М. Лук'янчык); М. Інькоў. «Кірыла Тураўскі»; І. Пратасеня. «Кірыла Тураўскі»; З. Азгур. «Францыск Скарына»; А. Глебаў. Помнік Ф. Скарыну ў Полацку; помнік С. Буднаму ў Нясвіжы (скульптар С. Гарбунова, архітэктар Ю. Казакоў); А. Шатэрнік.

«Мікола Гусоўскі»; В. Янушкевіч. Помнік Адаму Міцкевічу ў Навагрудку. Жывапіс: У. Пракапцоў. «А. Міцкевіч. Боль паэта»; Р. Вільчынскі. «Ян Чачот»; З. Азгур. Помнік Францішку Багушэвічу ў Жупранах; К. Асадаў.»Францішак Багушэвіч» (скульптурны барэльеф); Жывапіс: Я. Ціхановіч. «Партрэт Францішка Багушэвіча». Жывапіс: І. Ахрэмчык. «Францыск Скарына»; Г. Вашчанка. «Роднае слова. Францыск Скарына»; Л. Шчамялёў. «Францыск Скарына. Вяртанне». Музыка: Д. Смольскі. Опера «Францыск Скарына». Кінамастацтва: «Я, Францыск Скарына…» (рэжысёр Б. Сцяпанаў). Музыка: М. Агінскі. Паланэз «Развітанне з Радзімай». Кінамастацтва: «Ветрык арэляў» (рэжысёр С. Гайдук); «Паланэз Агінскага» (рэжысёр Л. Голуб).

Развіццё новай беларускай літаратуры XIX ст. (3 гадзіны)

Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст.

Ян Чачот. Звесткі пра жыццё і творчасць. Беларускамоўныя вершы «Покуль сонца ўзыдзе...», «Да мілых мужычкоў», «На прыезд Адама Міцкевіча» (1-2 на выбар педагагічнага работніка). Маральна-этычная і сацыяльная праблематыка твораў Я. Чачота. Прыпадабненне паэзіі да народнай творчасці (стылізацыя).

Францішак Багушэвіч. Звесткі пра жыццё і творчасць. Паэма «Кепска будзе!» (скарочана). Выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці ў паэме. Рэаліі XIX ст. у паэме; мова твора. Рэалізм у паказе лёсу і характару беларускага народа праз вобразы Аліндаркі і яго айчыма. Вобразы-антыподы ў творы.

Шляхі развіцця беларускай літаратуры першай паловы XX ст. (27 гадзін)

Беларуская літаратура пачатку XX ст. (10 гадзін)

Роля газет «Наша доля», «Наша ніва» ў гісторыі айчыннай культуры і мастацтва слова. Фарміраванне класічных асноў беларускай літаратуры. Прыход у літаратуру Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага, Вацлава Ластоўскага, Каруся Каганца, Ядвігіна Ш.

Цётка. Звесткі пра жыццё і творчасць. Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора». Патрыятычны змест лірыкі Цёткі, паэтызацыя непаўторнасці і хараства Бацькаўшчыны. Публіцыстычнасць вершаў паэтэсы.

Ядвігін Ш. Звесткі пра жыццё і творчасць. Апавяданне «Бярозка». Увага да праблем чалавечага быцця, сэнсу і каштоўнасці чалавечага існавання. Лірызм апавядання. Прытчавая аснова.

Янка Купала. Звесткі пра жыццё і творчасць (з апорай на раней вывучанае). Паэма «Курган». Тэма мастака і мастацтва. Вобраз гусляра як выразніка народнага светапогляду, неадольнага імкнення народа да справядлівасці, свабоднага жыцця. Князь як увасабленне зла. Сутыкненне духоўнасці, маральнасці, гуманізму з бездухоўнасцю, эгаізмам і бесчалавечнасцю – галоўны канфлікт твора. Маральная перамога гусляра над князем. Рамантычны характар сюжэта, вобразаў паэмы, асаблівасці кампазіцыі. Сувязь твора з фальклорам.

Якуб Колас. Звесткі пра жыццё і творчасць (з апорай на раней вывучанае). Трылогія «На ростанях» (частка першая «У палескай глушы», урыўкі). Жанравыя прыкметы аповесці «У палескай глушы». Гісторыя напісання, аўтабіяграфізм твора. Прататыпы галоўных герояў. Вобраз Андрэя Лабановіча – беларускага інтэлігента, шукальніка ісціны, сэнсу жыцця. Народ і інтэлігенцыя ў творы. Жаночыя вобразы.

Максім Багдановіч. Звесткі пра жыццё і творчасць (з апорай на раней вывучанае). Вершы «Песняру», «Кніга», «Летапісец», «Мяжы», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» (2-3 на выбар педагагічнага работніка). Зварот М. Багдановіча да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі. Скіраванасць да агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей. Багацце духоўнага свету лірычнага героя ў паэзіі аўтара. Верлібр у творчасці паэта.

Мастацтва. Скульптура: А. Заспіцкі. Помнік Цётцы ў г.п. Астрына; А. Ліпень. Помнік Цётцы ў Шчучыне. Жывапіс: М. Купава. «Алаіза Пашкевіч (Цётка)»; І. Пратасеня. «Думы Цёткі»; Ф. Янушкевіч. «Роздум. А. Пашкевіч (Цётка)»; Л. Шчамялёў. «Родны край»; А. Анікейчык. Помнік Янку Купалу ў Ляўках; «Малады Купала» ў Акопах (скульптары А. Заспіцкі і Г. Мурамцаў, архітэктар Ю. Казакоў); Я. Кругер. «Партрэт Якуба Коласа». І. Лучанок. «Роднаму краю»; У. Мулявін. «Каханне»; Л. Гумілеўскі. «Максім Багдановіч»; В. Янушкевіч. «Зорка Максіма Багдановіча» (бронза). Жывапіс: Д. Полазаў. «Партрэт Янкі Купалы»; А. Крывенка. «Пісьменнік, грамадскі і палітычны дзеяч Ядвігін Ш. (Лявіцкі Антон Іванавіч)»; І. Рэй. «Шлях паэта». Кінамастацтва: «Першыя выпрабаванні» (рэжысёр У. Корш-Саблін). Музыка: Д. Смольскі. «Арлыбрацці», «Вера беларуса», «Скрыпка».

Беларуская літаратура 1920-х – 1930-х гадоў (8 гадзін)

Літаратурныя аб'яднанні: «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», «Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў» і іншыя, іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Літаратура Заходняй Беларусі (Уладзімір Жылка, Максім Танк).

Максім Гарэцкі. Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Апавяданне «Літоўскі хутарок». Аўтабіяграфічнасць апавядання. Трагізм лёсу герояў. Антываенная скіраванасць твора. Чалавек і абставіны ў творы.

Уладзімір Дубоўка. Звесткі пра жыццё і творчасць. Вершы «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца…», «Родная мова, цудоўная мова!» (2-3 на выбар педагагічнага работніка). Грамадзянскае гучанне лірыкі паэта. Паэтызацыя прыроды, роздум над жыццём. Традыцыі фальклору ў лірыцы, уздзеянне паэзіі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча на творчасць У. Дубоўкі.

Кандрат Крапіва. Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Камедыя «Хто смяецца апошнім» (скарочана). Час напісання твора, грамадская атмасфера. Праблемы, узнятыя ў камедыі. Канфлікт у п'есе. Выкрыццё заган Гарлахвацкага і Зёлкіна. Развіццё характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Мова персанажаў. Скірванасць сатыры ў камедыі.

Кузьма Чорны. Звесткі пра жыццё і творчасць. Апавяданне «Макаркавых Волька». Час стварэння тэксту. Маральныя і грамадскія праблемы, адлюстраваныя ў ім. Высакароднасць галоўнай гераіні, паводзіны яе антыпода. Агульначалавечыя каштоўнасці ў творы.

Мастацтва. Скульптура: А. Грубэ. «Трактарыстка», «Беларус»; А. Арлоў. «Пагранічнік і калгасніца»; М. Рыжанкоў. Помнік М. Гарэцкаму ў Мінску. Кінамастацтва: «Максім Гарэцкі. Прысады жыцця» (рэжысёр І. Калоўскі); З. Азгур. «Пісьменнік Кузьма Чорны». Жывапіс: І. Ахрэмчык. «Падпісанне Маніфеста аб утварэнні БССР»; М. Філіповіч. «На Купалле», «Стары беларус з люлькай»; В. Бялыніцкі-Біруля. «Пачатак вясны»; П. Драчоў. Ілюстрацыі да выдання (У.Дубоўка. Выбраныя творы: у 2 т. – Мінск, 1965); І. Ахрэмчык. «Партрэт К. Чорнага». Музыка: опера «У пушчах Палесся» А. Багатырова; М. Шчаглоў-Куліковіч. «О Беларусь, мая шыпшына»; М. Равенскі. «На прасторах сініх», «Ліпнёвы гімн». Кінамастацтва: «Кандрат Крапіва» (рэжысёр М. Купеева); «Загадкі дзеда Кандрата» (рэжысёр А. Леўчык); «Хто смяецца апошнім» (рэжысёр У. Корш-Саблін).

Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) (3 гадзіны)

Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай літаратуры. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Пісьменнікі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны: П. Броўка, А. Куляшоў, Максім Танк, П. Панчанка, М. Сурначоў і іншыя.

Пятрусь Броўка. Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Верш «Спатканне». Лірычнае перажыванне салдата, які вяртаецца дадому. Выяўленне палымянай веры ў перамогу. Патрыятычны і грамадзянскі пафас твора.

Аркадзь Куляшоў. Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Балада «Над брацкай магілай». Суровая праўда ў паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае ў творы. Фальклорныя матывы ў баладзе.

Максім Танк. Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Верш «Родная мова». Сцвярджэнне духоўнай сілы, якую мае беларускае слова. Паказ веры ў неператожнасць народнага духу. Урачыстае гучанне верша, тон гімну роднай мове, перададзены аўтарам.

Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965) (6 гадзін)

Патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Вяртанне да класічных традыцый рэалістычнага мастацтва (проза І. Мележа, В. Быкава, Я. Брыля, паэзія А. Вялюгіна, А. Пысіна, М. Аўрамчыка, А. Вярцінскага, драматургія К. Губарэвіча, А. Макаёнка).

Максім Танк. Паэма «Люцыян Таполя». Тэма мастака і мастацтва, права мастака на самавыяўленне. Галоўны герой твора як выразнік таленавітасці і няскоранасці беларускага народа. Супрацьстаянне разьбяра з біскупам Сямашкам. Стылізацыя твора пад фальклорны.

Пімен Панчанка. Звесткі пра жыццё і творчасць. Вершы «Герой», «Родная мова», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы», «Крык сойкі» (2-3 на выбар педагагічнага работніка). Патрыятычны пафас ваеннай паэзіі П. Панчанкі. Гераічнае і трагічнае ў вершы «Герой». Роздум пра сэнс жыцця, гарманічныя адносіны паміж людзьмі і наваколлем.

Спавядальны характар паэзіі, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця.

Іван Мележ. Звесткі пра жыццё і творчасць. Раман «Людзі на балоце» (урыўкі). Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў – Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі. Драматызм становішча Глушака ў час калектывізацыі. Характары вяскоўцаў у творы. Роля Апейкі ў зменах, што прыйшлі на вёску.

Мастацтва. Жывапіс: Г. Вашчанка. «Маё Палессе»; А. Гараўскі. «Пінскія балоты»; Ю. Зайцаў. «Людзі Палесся». Кінамастацтва: «Людзі на балоце» (рэжысёр В. Тураў). Музыка: П. Падкавыраў. Фрагменты з вакальнага цыкла «Партызаны» (словы Янкі Купалы, Максіма Танка, Пімена Панчанкі). Жывапіс: М. Будавей. «Партрэт Пімена Панчанкі».

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання Максім Багдановіч. «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы». Пімен Панчанка. «Герой». Іван Мележ. Урывак з рамана «Людзі на балоце» (ад слоў «Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна...» і да слоў «...так і відаць – маладосць, сіла ў кожнай жылачцы!»).

АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне; выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх твораў розных жанраў; аналіз літаратурнага твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей; супастаўленне мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва; напісанне сачыненняў па апорнай схеме; падрыхтоўка вуснага водгука на мастацкі твор;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму (адказаў на праблемныя пытанні, паведамленняў, прэзентацый і іншых) з выкарыстаннем некалькіх крыніц; выкананне творчых заданняў па літаратуры.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць: асноўныя перыяды развіцця нацыянальнай літаратуры аўтараў, назвы і змест праграмных твораў; звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, неабходныя для разумення канкрэтнага твора; тэарэтыка-літаратурныя паняцці ў аб’ёме, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

умець:выконваць цэласны аналіз мастацкага твора ў адзінстве ідэйнага зместу і мастацкай формы; самастойна ацэньваць вывучаныя творы з улікам іх мастацкіх асаблівасцяў і абгрунтоўваць гэту ацэнку; выконваць пісьмовыя работы (сачыненне па апорнай схеме); рыхтаваць вусны водгук на мастацкі твор; рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў; выконваць творчыя заданні па літаратуры.

XII КЛАС (70 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (35 гадзін)

Агульныя звесткі аб мове (1 гадзіна)

Мова і маўленне. Веданне мовы і валоданне мовай.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Адрозніваць паняцці мова і маўленне. Усведамляць неабходнасць валодання мовай для паспяховай сацыялізацыі і самарэалізацыі.

Чытаць і аналізаваць тэксты, ствараць на іх аснове ўласныя вусныя і пісьмовыя выказванні.

Стылістыка (2 гадзіны)

Функцыянальныя стылі маўлення. Стылеўтваральныя моўныя сродкі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць сферу выкарыстання, задачы, асноўныя стылёвыя рысы, характэрныя моўныя сродкі гутарковага, мастацкага, навуковага, публіцыстычнага і афіцыйнага стыляў.

Распазнаваць тэксты розных стыляў маўлення; абгрунтоўваць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага стылю, выяўляць асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах розных стыляў і жанраў.

Ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Захоўваць нормы маўленчых паводзін у дыялагічным маўленні.

Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы (28 гадзіны)

Нормы дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў.

Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі і адасобленымі членамі, звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі; знакі прыпынку. Правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў.

Правілы пабудовы складаных сказаў (складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказаў, складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак); знакі прыпынку.

Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай.

Ужыванне складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Знаходзіць і выпраўляць сінтаксічныя і пунктуацыйныя памылкі ў чужым і ўласным маўленні.

Захоўваць сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы ў маўленні.

Карыстацца даведнікамі па сінтаксісе і пунктуацыі беларускай мовы. Рабіць падрабязны пераказ тэксту.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага (4 гадзіны)

Маўленчыя зносіны і маўленчы этыкет. Нормы сучаснай беларускай мовы; памылкі, выкліканыя іх парушэннем.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (35 гадзін)

Беларуская літаратура перыяду 1960-х – пачатку 1990-х гг. (30 гадзін)

Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х – пачатку 1990-х гг.

Літаратура ва умовах новай грамадскай сітуацыі. Агляд (1 гадзіна)

Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе гуманістычнага зместу. Жанрава-стылёвыя пошукі паэтаў (Максім Танк, П. Панчанка, А. Куляшоў, А. Вярцінскі, Я. Янішчыц, Н. Мацяш, Р. Баравікова, А. Разанаў, Г. Пашкоў, К. Камейша і іншыя аўтары).

Іван Шамякін (5 гадзін)

Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). «Сэрца на далоні» (скарочана). Маральна-этычныя праблемы ў рамане. Вастрыня канфлікту. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз кар’ерыста Гукана. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Вобраз Зосі Савіч, яе лёс. Маладое пакаленне ў рамане. Няўстойлівасць жыццёвай пазіцыі Славіка Шыковіча. Складаны шлях духоўнага станаўлення Тараса. Сімволіка назвы твора.

Андрэй Макаёнак (4 гадзіны)

Звесткі пра жыццё і творчасць драматурга. «Зацюканы апостал». Жанр трагікамедыі: спалучэнне камічнага і трагічнага ў творы. Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны канфлікт у камедыі. Сцвярджэнне аўтарам агульначалавечых духоўных каштоўнасцей. Майстэрства Андрэя Макаёнка ў абмалёўцы характараў.

Янка Брыль (2 гадзіны)

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка (з абагульненнем раней вывучанага). Лірычныя мініяцюры «Загадка», «Трохі пра вечнае» (на выбар педагагічнага работніка). Жанр лірычнай мініяцюры ў творчасці Янкі Брыля. Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў «малой прозе», паэзія «імгнення жыцця». Жыццесцвярджальны пафас твораў.

Васіль Быкаў (5 гадзін)

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка (з абагульненнем раней вывучанага). Аповесць «Жураўліны крык» (скарочана). Мастацкая праўда ў паказе вайны. Маральны выбар чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі. Раскрыццё характараў герояў у трагічных абставінах. Вытокі подзвігу старшыны Карпенкі, байцоў Глечыка, Фішара, Свіста. Глыбіня псіхалагізму ў раскрыцці вобразаў Аўсеева і Пшанічнага. Арыгінальнасць кампазіцыі. Лірычны элемент у аповесці, яго роля.

Уладзімір Караткевіч (5 гадзін)

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха». Гістарычная аснова твора. Атмасфера мінулай эпохі (80-я гг. XIX ст.). Праблемы дабра і зла, кахання, мужнасці і гераізму. Вобразы «святла»: Андрэй Беларэцкі, Андрэй Свеціловіч, Надзея Яноўская, Рыгор. Вобразы «цемры»: Дубатоўк, Варона. Асаблівасці кампазіцыі твора-дэтэктыва; інтрыга.

Ніл Гілевіч (1 гадзіна)

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Вершы «Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова…». Багацце лірычнай спадчыны паэта. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны, паэтызацыя прыроды – асноўныя тэмы паэзіі Ніла Гілевіча.

Іван Чыгрынаў (2 гадзіны)

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Памяць мінулай вайны і лёс старога лесніка Дземідзёнка. Выяўленне агульначалавечых каштоўнасцей у творы. Вобраз апавядальніка.

Іван Навуменка (2 гадзіны)

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Апавяданне «Сямнаццатай вясной». Сюжэт твора. Паказ моладзі ў гады вайны з фашызмам. Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Эмацыянальнасць зачыну апавядання, лірызм аповеду. Сімвалічнасць вобраза бэзу.

Рыгор Барадулін (1 гадзіна)

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Заспаная раніца мжыстая…», «Чалавек не ўзнікае так…». Тэматычнае багацце і арыгінальнасць раскрыцця ідэі ў паэзіі Р. Барадуліна. Свет радзімы, выяўленне пачуцця любові да зямлі бацькоў. Услаўленне роднага слова як духоўнай святыні. Роздум пра сэнс чалавечага жыцця. Шчырасць, даверлівасць пачуццяў, тонкі псіхалагізм і экспрэсіўнасць у вершах.

Алесь Разанаў (1 гадзіна)

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Вершы «Радзіма…», «Кожны народ мае…», «У крузе», «Спадчына», «Горад». Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта. Жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі: наватарскія пошукі, філасафізм, лаканічнасць, глыбіня думкі. Роля Алеся Разанава ў развіцці сучаснай беларускай эксперыментальнай паэзіі.

Георгій Марчук (1 гадзіна)

Звесткі пра жыццё і творчасць. Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці». Жанравая і стылёвая адметнасць твораў, іх спавядальнасць. Элементы «плыні свядомасці». Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Погляд аўтара на чалавечае шчасце і свет.

Мастацтва. Скульптура: С. Вакар. «Пісьменнік У. Караткевіч». Жывапіс: М. Будавей. «Партрэт Івана Шамякіна»; У. Масленікаў. «Мае бацькі ў маі 1945 года»; У. Тоўсцік. «Памяці Караткевіча»; У. Зінкевіч. «Партрэт У. Караткевіча»; М. Будавей. «Партрэт У. Караткевіча»; ілюстрацыі да аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» М. Басалыгі, А. Кашкурэвіча, Ю. Якавенкі; Л. Дударанка. «Беларускія пісьменнікі. Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Ніл Гілевіч»; М. Будавей. «Партрэт В. Быкава»; М. Данцыг. «Партрэт В. Быкава»; А. Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да аповесцей Васіля Быкава «Пайсці і не вярнуцца», «Яго батальён»; Г. Паплаўскі. Ілюстрацыі да аповесцей Васіля Быкава «Дажыць да світання», «Сотнікаў»; У. Тоўсцік. «Васілю Уладзіміравічу Быкаву прысвячаецца», «Васілёва зорка»; М. Будавей. «А. Макаёнак»; М. Будавей. «Партрэт Я.Брыля»; В. Жолтак. «Восеньская сімфонія»; І. Рэй. «Зямля мая беларуская». Музыка: У. Солтан. Опера «Дзікае паляванне караля Стаха»; І. Лучанок. Песня «Я хаджу закаханы» (словы Н. Гілевіча); Э. Ханок. Песня «Вы шуміце, бярозы...» (словы Н. Гілевіча); цыкл твораў «Аксамітавы вечар»; Нашы песні» (ансамбль «Сябры»). Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Сэрца на далоні», «І змоўклі птушкі» (па творах Івана Шамякіна); спектакль «Зацюканы апостал» (рэжысёр Б. Луцэнка); спектакль «Князь Вітаўт» (рэжысёр В. Раеўскі, Б. Герлаван). Кіна- і тэлемастацтва: «Дзікае паляванне караля Стаха» (рэжысёр В. Рубінчык); мастацкі фільм «Вазьму твой боль» (рэжысёр М. Пташук).

Беларуская літаратура на сучасным этапе (5 гадзін)

Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе. Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Літаратурна-мастацкія выданні («Полымя», «Маладосць» і іншыя).

Паэзія (2-3 аўтары на выбар педагагічнага работніка): А. Бадак, М. Башлакоў, Н. Гальпяровіч, М. Дукса, М. Мятліцкі, М. Пазнякоў, Г. Пашкоў, А. Разанаў, Ю. Свірка і іншыя. Паглыбленне агульначалавечага, маральнафіласофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянскапубліцыстычнага і індывідуальна-асобаснага пачаткаў.

Проза (2-3 аўтары на выбар педагагічнага работніка): А. Савіцкі. «Пісьмо ў рай»; І. Чыгрынаў. «Вяртанне да віны»; І. Навуменка. «Вір»; Я. Сіпакоў. «Кулак» і іншыя аўтары. Тэматыка і сацыяльна-філасофская праблематыка сучаснай прозы. Асэнсаванне пісьменнікамі стасункаў асобы і грамадства, повязі часоў і пакаленняў.

Драматургія (1-2 аўтары на выбар педагагічнага работніка педагагічнага работніка): А. Петрашкевіч, У. Бутрамееў, Р. Баравікова і іншыя аўтары. Традыцыі драматургіі Кандрата Крапівы і Андрэя Макаёнка, творчае выкарыстанне гэтых традыцый маладзейшымі пісьменнікамі. Узмацненне цікавасці да гістарычнага мінулага. Мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі. Сучасная драматургія і тэатр.

Мастацтва. Жывапіс: І. Рэй. «З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы», «Беларуская восень», «Поры года»; У. Гоманаў. «Партрэт А. Петрашкевіча». Тэатральнае і кінамастацтва: спектакль «Адкуль грэх?» (рэжысёр П. Малчанаў, па творы А. Петрашкевіча), тэлеспектакль «Прарок для Айчыны» (па творы А. Петрашкевіча).

Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання

Міхась Стральцоў. Урывак з апавядання «Сена на асфальце» (пачынаючы са слоў «О зямля! Ты даеш нам тугу па небе…» і да слоў «…гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога»). Ніл Гілевіч. «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..». Верш з сучаснай беларускай паэзіі (на выбар вучняў).

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне;

выразнае чытанне, пераказванне мастацкіх твораў розных жанраў;

аналіз літаратурнага твора, аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей; супастаўленне мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва; напісанне сачыненняў па апорнай схеме;

падрыхтоўка вуснага водгука на мастацкі твор;

падрыхтоўка выступленняў на літаратурную тэму (адказаў на праблемныя пытанні, паведамленняў, рэфератаў, прэзентацый і іншых) з выкарыстаннем некалькіх крыніц; выкананне творчых заданняў па літаратуры.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення беларускай літаратуры вучні павінны:

ведаць: асноўныя перыяды развіцця нацыянальнай літаратуры; аўтараў, назвы і змест праграмных твораў; звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, неабходныя для разумення канкрэтнага твора; тэарэтыка-літаратурныя паняцці ў аб’ёме, дастатковым для аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

умець: выконваць цэласны аналіз мастацкага твора ў адзінстве ідэйнага зместу і мастацкай формы; самастойна ацэньваць вывучаныя творы з улікам іх мастацкіх асаблівасцяў і абгрунтоўваць гэту ацэнку; выконваць пісьмовыя работы (сачыненне па апорнай схеме); рыхтаваць вусны водгук на мастацкі твор; рыхтаваць вусныя выступленні розных тыпаў; выконваць творчыя заданні па літаратуры.